№ 12 (322) 28 сакавіка 2003 www.nn.by

Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

Вясна

Вясна ідзе...
Давайце жыць вясной! —
каткамі на галінках любавацца,
глядзець,
як растае зляжалы snø*,
і на апошнім лёдзе спатыкацца.

Славамір Адамовіч



*snø — сьнег (нарвэск.)

Дзень Волі не задаволіў

Дыскусія па сьлядах юбілею.

старонкі 2, 4

Дамова з д'яблам

Чаму забілі Зорана Джынджыча.

старонка 6

Мова-2003

Гаворым і пішам правільна: культура мовы.

старонка 14

Сонца нам дапаможа

Вясна сёлета пачалася з канцэрту «Я нарадзіўся тут», што адбыўся 20 сакавіка.
«Сонца нам дапаможа. Яно любіць нас», — сьпявае Лявон Вольскі на фота.
Старонка 12.

«За апошні год я браў удзел у двух міжнародных конкурсах этнамузыкі, і ў абодвух быў ляўрэатам. Прафэсійна заходнія музыкі вышэйшыя на некалькі галоў, але матэрыял, які даём мы, — мацнейшы. У нас ёсьць людзі, якія і самі могуць стварыць традыцыю. Лявон Вольскі можа быць айцом-заснавальнікам у якой хочаце сфэры. Міхаіл Фінберг таксама». Гутарка са Зьмітром Вайцюшкевічам — старонка 13.

АНАТОЛЬ КЛЯЦЧУК

Кантактная вайна

Іракцы, здраджаныя ў 1991-м, не сьпяшаюцца падтрымаць ЗША ў новым змаганьні з тыраніяй. Амэрыканцы спадзяваліся на бліцкрыг і «віваты» вызваленых шыітаў. Яны разьлічвалі выйграць вайну без кантактнага ўдзелу амэрыканскай пяхоты, як у Югаславіі ці Аўганістане. Вашынгтонскія аналітыкі недаацанілі значэньне нацыянальнага суверэнітэту для жыхароў Іраку. «Шокам і жахам» марскіх пехацінцаў стаў зацяты супраціў Рэспубліканскай гвардыі. Амэрыканскія тэлеканалы прайграюць інфармацыйную вайну «Аль-Джазіры». У дадатак часта памыляецца амэрыканская выведка і кепска каардынуюцца дзеяньні брытанскіх саюзьнікаў, што губляюць пад «сяброўскім агнём» машыну за машынай.

Войскі каліцыі сутыкаюцца з варожасьцю насельніцтва. І гэта дратуе іхных камандзіраў больш за пясчаныя буры і пазелянелыя твары палонных тылавікоў на тэлеэкранах. Калі вайна ў Іраку не вызвольная, яе робіцца цяжка апраўдаць. Магутны прапагандысцкі апарат амэрыканцаў выявіўся вельмі датклівым у барацьбе з падступнай дэспатыяй. Тоны атрутных газаў ня зьнішчаныя Садамам, але іх трэба прадэманстраваць сьвету, каб той зразумеў маштаб небясьпекі. Штабы Хусэйна зьмяшчаюцца то пад дзіцячым домам, то пад галоўным шпіталем, але як гэта дакажаш?

Чакалася, што бітва за Багдад стане першай сухаземнай вайной новага пакаленьня. Замест гэтага яна ператвараецца ў гіганцкую мясарубку. Міністар абароны Вялікай Брытаніі Джэфры Хун прызнаў, што «страты цывільнага насельніцтва будуць павялічвацца, але гэта не адаб'ецца на ходзе апэрацыі».

Амэрыканцы прасоўваюцца наперад, раўнуючы пазыцыі праціўніка зь зямлёю. Так было ўначы з аўторка на сераду пад Наджафам, дзе загінулі некалькі соцень іракцкіх байцоў.

Працяг на старонцы 2.

НЕЎЗАБАВЕ Ў «НН»

Кніга летніх дарог

У траўні «Наша Ніва» пачынае публікацыю запісаў Рыгора Барадуліна «З запазухі». У летніх вандроўках заставайцеся з «Нашай Нівай».

«Наша Ніва» запрашае

да супрацоўніцтва рэклямныя агенцтвы і агентаў па рэкляме на выгадных умовах. Інфармацыю пра сябе дасылайце на электронны адрас nn@promedia.by.

Т./факс: 284-73-29.

Кантактная вайна

Працяг са старонкі 1.

У Насірыі баі ля пераправы цераз Эўфрат працягваюцца пяць дзён, «джы-ай» вымушаныя ператрасаць будынак за будынкам у пошуках фэдаінаў. У сераду бамбёжкі працягваліся, нягледзячы на буры. У выніку ракеты папалі ў багдадзкі базар. Амэрыканцы сьпяшаюцца падысьці да Багдаду за сакавік. 1 красавіка поўня, якая палегчыць танкавыя ды паветраныя атакі. Надыходзіць і летняя сьпякота.

Не адбыліся паўстаньні шыітаў і курдаў, якія прадракала ірацкая апазыцыя. У 1991-м поўдзень і поўнач краіны ўзьняліся супраць суніта Хусэйна. Але амэрыканскія войскі тады спыніліся пад Басрай і Насірыяй, каб пасьля адступіць у Кувэйт, а з паўстанцамі расправілася Рэспубліканская гвардыя. Амэрыка Буша-бацькі баялася нэгатыўных наступстваў распаду Іраку і сваіх людзкіх стратаў.

Буш-сын ахвяраў не баіцца. Але ў кантактнай вайне, а пагатоў вайне партызанскай, байцы кааліцыі не пачуваюцца так упэўнена, як у высокатэхналягічнай паветранай.

Ад посьпеху першых двух дзён у саюзьнікаў закруцілася галава. Цяпер жа складаецца ўражаньне, што Хусэйн не падпаліў сьвідравіны толькі таму, што разьлічвае яшчэ сам зь іх скарыстацца. Уладныя эліты Багдаду даравалі яму і большыя паразы, чым цяперашняя, калі на кожнага забітага амэрыканца прыпадае з сотню іракцаў.

Прамаруджваньне ў вайне ўжо выклікала спад актыўнасьці на сусьветных біржах. Правал апэрацыі ня толькі падкасіў бы папулярнасьць самаўпэўненае амэрыканскае адміністрацыі, але і абваліў сусьветную эканоміку.

На сьвітанку 13 лютага 1991 г. два амэрыканскія бамбавікі F-117 скінулі па 1000-кіляграмовай бомбе на бункер у Заходнім Багдадзе. Меркавалася, што там месьціцца камандны пункт Садама Хусэйна. У выніку загінулі больш за трыста чалавек, у тым ліку каля сотні дзяцей. Бункер аказаўся звычайным бамбасховішчам. Ці, прынамсі, такое бамбасховішча разьмяшчалася над ім. Гэта была найбольшая трагедыя папярэдняй вайны.

Цяпер амэрыканцы ставілі задачу любой цаной пазьбегчы такіх памылак. Цаной сталі жыцьці амэрыканскіх салдат. Дональд Рамсфэльд адпраўляе ў Мэсапатамію дадатковыя 30 тыс. пехацінцаў.

Амэрыканцы хочуць пазбавіць Садама ўлады і закласьці ў Іраку асновы дэмакратычнага ладу. Таму апэрацыя мела быць узорнай. Пасьля першага тыдня вайны зьявіліся сумневы ў канчатковым посьпеху пачатковага пляну.

Мікола Бугай

КАЛЁНКА РЭДАКТАРА

Мясарубка ўжывую

Тэлебачаньне ператварае вайну ў грандыёзны блякбастэр з амаль пэўным і ўсё ж крышачку непрадказальным канцом. Замест таматнага соку на экранах цячэ сапраўдная кроў — на момант, калі я пішу гэтыя радкі, загінула 67 салдатаў кааліцыі і ня менш за 3000 ірацкіх. Садам, як некалі Сталін, сваіх байцоў ня лічыць. Наадварот, робіць усё, каб павялічыць колькасьць цывільных ахвяраў. Сваю тактыку ён запазычыў у партызанаў другой сусьветнай. Спадзявацца яму больш няма на што. На полі бою шанцаў ірацкая армія ня мае. Прыцісьнуты да сьценаў сваіх незьлічоных бункераў, пазбаўлены незьлічоных палацаў, Садам без згрызотаў сумленьня кідае на ахвярнік сусьветнае грамадзкае думкі — адзінага, што можа яго ўратаваць, — тысячы жыцьцяў. А мы назіраем за гэтай мясарубкай ужывую. Мы і ёсьць, дарэчы, гэтай самай сусьветнай грамадзкай думкай.

Андрэй Дынько

Сродак шантажу

Зьмены ў кіраўніцтве МЗС адлюстроўваюць зьмены калі ня зьместу замежнай палітыкі, дык пэўных акцэнтаў у ёй. Вельмі доўга ўлада падкрэсьлівала прыярытэтнасьць усходняга вэктару і ў выніку атрымала лягічныя прапановы У.Пуціна аб інкарпарацыі Беларусі ў склад Расеі. Задачы, пастаўленыя перад новым міністрам замежных справаў Сяргеем Мартынавым («нармалізаваць адносіны з ЗША» і «разьвіваць адносіны з Расеяй»), сьведчаць аб жаданьні Лукашэнкі паказаць Маскве, што ён мае моцны козыр і пры неабходнасьці зноў пакладзе яго на стол. На несьбыўскія дзеяньні Крамля афіцыйны Менск адкажа шантажом пераарыентацыі на Захад.

Расейскі істэблішмэнт добра разумее, што Лукашэнка даўно спаліў за сабой масты і пагрозы «нармалізаваць адносіны з ЗША» — пусты гук. Амэрыцы няма сэнсу зьмяняць сваю пазыцыю адносна ізнага ў Беларусі рэжыму. Да таго ж складана ўявіць, што барацьбіт з «заходнімі шпіёнамі» Хвастоў, прызначаны амбасадарам у Злучаныя Штаты, зьменіць сытуацыю, якая склалася ў беларуска-амэрыканскіх адносінах. У тым ліку дзякуючы і яго намаганьням.

Афіцыйны Менск не хавае, што непасрэдным аб'ектам яго гульні цяпер ёсьць ня сам Крэмль, а расейскі электарат, які разважае ў катэгорыях халоднай вайны. Вясной 2004 г. У.Пуціна чакаюць прэзыдэнцкія выбары, і яму не на руку тлумачыць расейскай аўдыторыі нюансы адносінаў з Лукашэнкам. «Інтэграцыя зь Беларусяй» з часоў Ельцына ёсьць часткай перадвыбарнай плятформы кандыдата ў прэзыдэнты Расеі.

Андрэй Ляховіч

Амаладжэньне на тэлебачаньні

Новых кіраўнікоў дзяржаўных СМІ лучыць палітычная асьцярожнасьць і прафэсійная амбіцыйнасьць.

21 сакавіка адбыліся зьмены ў кіраўніцтве дзяржаўных мас-мэдыяў. Першым намесьнікам старшыні Белтэлерадыёкампаніі прызначаны Аляксандар Саламаха, намесьнікамі старшыні — Аляксандар Мартыненка і Вольга Апанасовіч. Галоўным рэдактарам «Народнай газеты» стаў Валер Логвін. Чарговая кадравая ператасоўка на першы погляд выглядае як перамена дэталяў пры складаньні пазлу: усе яны настолькі невялікія, што цяжка зразумець, чым адна розьніцца ад другой.

Гадаванец ВПШ Аляксандар Саламаха працаваў раней у «Чырвонай змене», Адміністрацыі прэзыдэнта, узначальваў галоўнае ўпраўленьне грамадзка-палітычнай інфармацыі, пасьля правёў рэформу Беларускага радыё. Ягоны брат займае пасаду намесьніка рэдактара «ЛіМу». Цяпер у руках А.Саламахі апынаецца кантроль над Першым нацыянальным тэлеканалам. Кардынальных зьменаў на БТ не чакаюць. Аляксандар Мартыненка, выпускнік журфаку БДУ 1993 г., апошнім часам быў генэральным дырэктарам АТН. З А.Саламахам яго лучаць здаровая прафэсійная амбіцыйнасьць і палітычная асьцярожнасьць. Прызначэньне Вольгі Апанасовіч — навіна для НДТРК. Упершыню на такой пасадзе зьявілася жанчына.

Валер Логвін да апошняга часу працаваў галоўным рэдактарам абласной «Гомельскай праўды», у 2000 г. стаў дэпутатам палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Зь ягоным прыходам супрацоўнікі газэты зьвязваюць надзеі на эканамічнае аздараўленьне, стабілізацыю накладу і зьмену палітычнай пазыцыі выданьня, якое ў апошнія гады было трыбунай праваслаўнага шавінізму.

АШ; МБ

Дзень Волі ў дзяржаўных СМІ

На сайце прэзыдэнта Аляксандра Лукашэнкі зьявілася нэўтральная інфармацыя пра Дзень Волі. Галоўны ж прэсавы рупар уладаў, «Беларусь сегодня», у сваёй рубрыцы «Каляндар» юбілею ня згадвае.

СП

Маральнай перавагі мала

Сёньняшняя тактыка нацыянальна-дэмакратычнай апазыцыі трохі падобная да савецкіх дысыдэнцкіх практыкаў 70-х гадоў XX ст. Але для дысыдэнтаў колькасны паказьнік быў неістотны: важны быў сам факт, што хтосьці выступае супраць сыстэмы. Дысыдэнты не маглі ствараць партыі, легальна выдаваць газэты, браць удзел у выбарах. Сёньня ж аднаго ўсьведамленьня сваёй маральнай перавагі над рэжымам мала.

На мітынг, што ладзіўся 23 сакавіка ля Паштамту, як паведаміла пасьля афіцыйная рассылка КХП-БНФ, сабраліся «сотні людзей». Відавочна выпала слова «паўтары». Акцыя была шэрая і пахмурная, як той нядзельны дзянёк. Людзі стаялі ціха, бяз кветак, амаль безь сьцягоў. Вакол — процьма журналістаў. Ды міліцэйскі «мацюкальнік» пэрыядычна нагадваў, што гэта мітынг і прысьвечаны ён 85-й гадавіне ўтварэньня Беларускай Народнай Рэспублікі. Найбольшаму нацыянальнаму сьвяту — дадамо ад сябе.

Разгон таксама быў тыповы, адпрацаваны на дзясятках падобных акцыяў. Арганізатары павялі людзей у заплянаваным кірунку, наперад ведаючы, што іх нікуды ня пусьцяць. Вынік — пад 50 затрыманых. Многія выпалі з працы на паўмесяца. Словам, усё як заўсёды. Але калі ўладам такая схематызацыя толькі на руку, бо спрашчае задачу, дык для нацыянальнага руху яна — сьмяротная. На мітынгах амаль не відаць новых твараў. Гэта не таму, што людзі змаргіналізаваліся, здрадзілі або баяцца. Папросту ў акцыях няма драйву, няма сьвежай жывой думкі, «творчага падыходу». На іх ідуць як на Галгофу.

Тым больш што на аўтаматычную каналізацыю кожнага апазыцыянэра, як гэта было за саветамі, можна не разьлічваць. Чым далей цягнуцца расколы, дробныя ўзаемныя прэтэнзіі, няўменьне дамовіцца ў элемэнтарных пытаньнях, тым меней людзі атаясамліваюць патрыятычны абавязак з наведваньнем мітынгаў.

Андрэй Скурко

Трагедыя — у разьяднанасьці

З звароту Старшыні Рады БНР Івонкі Сурвіллы з нагоды Дня Волі:

«Хацела б падзяліцца думкамі пра нашую найбольшую патрэбу — еднасьць.

Трагедыя нашага народу — як на Бацькаўшчыне, так і на чужыне — гэта адсутнасьць між намі адзінства і салідарнасьці. Думаю, што выплывае гэта з нашага скрайняга індывідуалізму. Дзіўны парадокс беларускае натуры: беларус памяркоўны ў дачыненьні да чужых, але часта вельмі непамяркоўны ў дачыненьні да сваіх. На дзіва, гістарычна гэта не ператварылася ў нетолерантнасьць нашага народу.

Затое на кожным кроку бачу, да чаго вядзе наша міжсобная непамяркоўнасьць.

Сёньня заклікаю кожнага палітычнага і арганізацыйнага лідэра: яднайце людзей вакол ідэалаў 25-га Сакавіка і яднайцеся між сабою».

IREX-PROMEDIA

Новыя правыя

Акцыя 23 сакавіка можа мець разьвіцьцё — у бок кансалідацыі. Яе зладзілі супольнымі намаганьнямі прадстаўнікі КХП-БНФ, прыхільнікі Вячаслава Сіўчыка, сябры «Маладога фронту» і БПС. Утварэньне нацыяналістычнае правае сілы ажывіла б сытуацыю і стала б прызнаньнем таго разлому, які фактычна ўжо адбыўся. Дастаткова фармальна замацаваць адзінства, і можна будзе гаварыць пра новых правых.

Барыс Тумар

АЭС ня будзе. Задуманая рэформа энэргасыстэмы

Міністар энэргетыкі Ўладзімер Сямашка й дырэктар Акадэміі навук Міхаіл Мясьніковіч выступілі за пабудову АЭС. Але Аляксандар Лукашэнка іх не падтрымаў.

Міністэрства энэргетыкі прапанавала ўраду камэрцыялізаваць вытворчасьць і продаж электраэнэргіі. Адзіную энэргасыстэму краіны падзеляць на тры сэктары паводле функцыяў: генэравальны (выпрацоўка энэргіі), перадавальны ды разьмеркавальны. Прадпрыемствы розных сэктараў ня будуць, як цяпер, дзяліць прыбыткі ды выдаткі. Вытворчасьцю электрычнасьці зойміцца некалькі дзяржаўных кампаніяў-канкурэнтак. Калі ўрад пойдзе на тое, каб за лініі электрапередачаў ды разьмеркаваньне энэргіі паміж спажыўцамі таксама адказваў не манапаліст, а незалежныя структуры, будзе створаны сапраўдны рынак электрычнасьці.

Як гэта можа выглядаць, відаць на прыкладзе Нямеччыны. Тамтэйшыя канцэрны, што гандлююць электрычнасьцю, разгортваюць сапраўдныя рэклямныя войны за кліентаў. Электраэнэргія — тавар, цяжкі для прасоўваньня на рынак. Яна ня можа быць лепшай ці горшай — электрычнасьць аднолькавая ва ўсіх канкурэнтаў. Розьніцца толькі цана, прычым вельмі нязначна. Таму гандляры энэргіяй ідуць на маркетынгавыя хітрыкі. Гэтак, канцэрн «Yellow Strom» прыдумаў, што ягоная электрычнасьць мае жоўты колер. Менавіта гэтая, на першы погляд, бязглузьдзіца прыцягнула ўвагу шараговых спажыўцоў.

Аднак спадзявацца на поўную лібэралізацыю энэргетычнага рынку ў нашай краіне зарана. Назіраць за цэнаўтварэньнем ды выдаваць ліцэнзіі будзе новая дзяржаўная структура — Нацыянальная энэргетычная камісія, дужа падобная да расейскай Фэдэральнай энэргетычнай камісіі. Ніводнай з трох частак энэргакомплексу не закране прыватызацыя. Акцыянуюць хіба некаторыя арганізацыі, што займаюцца выпрацоўкай энэргіі ці будаўніцтвам аб'ектаў энэргетычнай інфраструктуры. Пачнецца рэформа з таго, што тры галоўныя электрастанцыі (Лукомская ды Бярозаўская ГРЭС, а таксама Менская ЦЭЦ-5), якія падпарадкоўваюцца абласным энэргааб'яднаньням, атрымаюць адзінага кіраўніка — «Белэнэрга».

Падрыхтоўка праекту рэформы Міністэрствам энэргетыкі пачалася пасьля таго, як Лукашэнка запатрабаваў да 1 ліпеня рэарганізаваць гэтую ўстанову. Падчас нарады ў Мінэнэргетыкі выцягнулі былі з шуфляды пляны пабудовы беларускай атамнай электрастанцыі. Галоўнымі яе лабістамі былі Ўладзімер Сямашка і Міхаіл Мясьніковіч. Іх апанэнты, якіх ачольвае Леў Дубовік, старшыня Камітэту па энэргаэфэктыўнасьці пры Саўміне, лічаць, што варта больш рацыянальна выкарыстоўваць унутраныя энэргарэсурсы. Лукашэнка пагадзіўся з апошнімі ды загадаў разьвіваць альтэрнатыўныя крыніцы энэргіі.

Аднак галоўная крыніца — не электраветракі ці сонечныя батарэі, а адмыслоўцы-прафэсіяналы, здольныя перабудаваць прадпрыемствы такім чынам, каб спажывалася менш энэргіі. Паводле разьлікаў ведамства Л.Дубовіка, да 2020 г. Беларусі будзе патрэбна на 41 млрд. кВт/г электрычнасьці больш, чым цяпер. За кошт энэргазьберажэньня можна зэканоміць каля 45 млрд. кВт/г. Таму вырашана, што бязь мірнага атаму можна будзе абысьціся.

Алесь Кудрыцкі



IREX-PROMEDIA

Райсавет пайшоў за апазыцыяй

Менскі райсавет новага складу запярэчыў перадачы земляў гораду Менску.

Апазыцыя ў Менскім райсавеце складаецца з двух чалавек. Адзін зь іх — дэпутат Юрась Зянковіч.

Першая сэсія новаабранага райсавету разглядала два пытаньні — абраньне новага кіраўніцтва і перагляд межаў раёну на карысьць сталіцы. Старшынёй (28 «за», 3 «супраць») была абраная Галіна Харытонава — кіраўніца аднаго зь сельсаветаў. Бурнае абмеркаваньне выклікала другое пытаньне.

Прадстаўнік праектнага інстытуту «Белгіпразем» патлумачыў, што Менск хацеў бы ўзяць пад свой кантроль 3757 га на тэрыторыі Ждановіцкага, Папярнянскага і Цьнянскага сельсаветаў, якія ўваходзяць у ахоп Менскай кальцавой аўтадарогі. Уладальнікі найбольшых надзелаў на гэтых тэрыторыях — агракамбінат «Ждановічы», ТАА «Ждановічы» (самы буйны з рынкаў, на якія езьдзяць менчукі), Менская птушкафабрыка імя Н.Крупскай, 1-я Менская птушкафабрыка ды інш. Улучыць гэтыя тэрыторыі ў межы Менску даручыў А.Лукашэнка на нарадзе па горадабудаўнічым разьвіцьці Менску ў жніўні 2002 г.

Аднак ход абмеркаваньня зьмянілі дэпутаты ад апазыцыі. Пачалося з выступу Ю.Зянковіча (Ждановічы, БНФ). «Гарадзкія ўлады хочуць папоўніць свой бюджэт за кошт падаткаў ад Ждановіцкага рынку. Калі гэтыя грошы пойдуць у гарадзкі бюджэт, а не ў раённы, як вы будзеце глядзець у вочы сваім выбарцам: настаўнікам, дактарам?» — запытаўся малады дэпутат і прапанаваў зьняць пытаньне з разгляду як недапрацаванае. Падтрымаў яго і запрошаны на паседжаньне дэпутат палаты прадстаўнікоў Ўладзімер Дзялендзік: «Гэта апэтыты менскага мэра Паўлава, а не неабходнасьць гарадзкога разьвіцьця. Гораду ёсьць куды расьці: уздоўж праспэкту Дзяржынскага, у Лошыцы стаяць пусткі». У выніку аднагалосна перамагла прапанова Ю.Зянковіча: дэпутаты райсавету адправілі праект рашэньня на дапрацоўку.

Аркадзь Шанскі

Чаму не прыехаў Кабзон

Расейскі сьпявак Іосіф Кабзон адмяніў свой канцэрт у Менску, заплянаваны на 26 сакавіка. Напярэдадні дзеячы беларускай культуры зьвярнуліся да яго зь лістом: прасілі не выступаць у рамках «дня яднаньня Расеі й Беларусі». Падпісалі зварот Зінаіда Бандарэнка, Радзім Гарэцкі, Сяргей Законьнікаў, Адам Мальдзіс, Юры Хадыка. Ініцыяваў зварот кіраўнік зарэгістраванага ў ЗША Сусьветнага згуртаваньня беларускіх габрэяў Якаў Гутман. У тэксьце ўвага сьпевака зьвяртаецца на выданьне антысэміцкае кнігі «По законам подлости» і разбурэньне гістарычнага будынку на Дзімітрава, 3.

Асабіста зьвярнулася зь лістом да І.Кабзона народная артыстка Беларусі Зінаіда Бандарэнка, якая добра ведае сьпевака й неаднойчы вяла канцэрты зь ягоным удзелам. Яна напісала: «Паважаны Іосіф Давыдавіч, на жаль, няўдала абралі Вы дзень для свайго канцэрту ў Менску. Хутчэй за ўсё, Вы проста ня ведаеце, што 25 Сакавіка ўсе свабодалюбівыя людзі Беларусі адзначаюць свой гістарычны Дзень Волі. А як паказвае практыка апошніх гадоў, усе акцыі ў Менску з нагоды Дня Волі заканчваюцца арыштамі й штрафамі. А Вы ж літаральна на наступны дзень даяце канцэрт, прысьвечаны так званаму дню яднаньня Расеі й Беларусі. Многія беларусы, якія шчыра й даўно любяць Вашую творчасьць, не зразумеюць Вашай пазыцыі».

На звароце беларускай інтэлігенцыі сьпявак напісаў рэзалюцыю: «Канцэрт адмяніць».

Праўда, ня выключана, што сапраўднай прычынай быў кепскі продаж квіткоў. Прадстаўнікі кампаніі «Кляс-клюб Джаз Крафт», якая займалася арганізацыяй канцэрту, паведамілі, што агулам удалося прадаць ня больш за 200 штук. Каштавалі яны ад 20 да 100 тыс. рублёў.

Аркадзь Шанскі

• ТЫДЗЕНЬ НАШАГА ЖЫЦЬЦЯ •

Праляскоўскі – новы ідэоляг

Новым намесьнікам кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта прызначаны Алег Праляскоўскі, які зь сьнежня 2002 г. узначальваў БелТА, а перш — адзін з аддзелаў Службы бясьпекі кіраўніка дзяржавы. Станіслаў Князеў, які раней быў намесьнікам кіраўніка Адміністрацыі, прызначаны рэктарам Акадэміі кіраваньня пры прэзыдэнце. Пятро Кухарчык прызначаны рэктарам БДПУ імя Максіма Танка, а Яўген Матусевіч — дырэктарам НДІ тэорыі й практыкі дзяржаўнага кіраваньня Акадэміі кіраваньня. Кадравыя зьмены А.Лукашэнка тлумачыць патрэбай «узмацніць ідэалягічную працу ў дзяржаве». А.Праляскоўскі беларус, але нарадзіўся ў Сергіевым Пасадзе, што за Масквой.

Вайтовіч у Кіеве

Сьпікер савету рэспублікі Аляксандар Вайтовіч наведаў Украіну. У Кіеве яго прынялі прэзыдэнт Леанід Кучма, прэм'ер і старшыня Вярхоўнае Рады.

Антончыка абрабавалі

24 сакавіка ў Менску была абрабаваная кватэра экс-дэпутата Сяргея Антончыка. Зладзеі вынесьлі музычны цэнтар, тэлевізар, відэамагнітафон і некалькі касэтаў да яго. З дапамогай гэтае апаратуры кандыдат у дэпутаты гарсавету Сяргей Чыслаў дэманстраваў выбарцам фільмы «Звычайны прэзыдэнт» і «Дзікае паляваньне», за што і быў зьняты зь перадвыбарнае гонкі. Цікава, што зьніклі касэты менавіта з вышэйзгаданымі фільмамі.

АНАТОЛЬ КЛЯЦЧУК

Забойца Аміна памёр у Беларусі

Былы камандзір групы «Альфа» Віктар Карпухін памёр у цягніку Менск—Масква ў ноч на панядзелак. У 1979 г. ён кіраваў зьнішчэньнем прэзыдэнта Аўганістану Аміна, пасьля якога пачалася інтэрвэнцыя савецкіх войскаў у краіну. У Менск былы спэцназавец прыяжджаў на сьвяткаваньне чарговае гадавіны беларускай Асацыяцыі воінаў-інтэрнацыяналістаў. Па дарозе дамоў былому дывэрсанту зрабілася блага з сэрцам.

Радзіма пэнэўманіі — Кітай

Мэдыкі Ганконгу высьветлілі, што 80 з 156 хворых на сьмяротную форму пнэўманіі мелі кантакт з адным і тым жа чалавекам — кітайскім доктарам, жыхаром правінцыі, што прыехаў у госьці ў Ганконг. Ягоныя сваякі і трапілі першыя ў шпіталь ды заразілі там пэрсанал. Дасьледаваньні сьведчаць, што «радзіма» новае хваробы — Кітай. Першыя выпадкі захворваньня былі выяўленыя там яшчэ летась у лістападзе, але інфармацыю пра гэта хавалі.

Нялёгкія цыгарэткі

Кампанія «Філіп Морыс» аштрафаваная на 10,1 млрд. даляраў. Суд штату Ілінойс пастанавіў, што канцэрн падманваў курцоў, сьцьвярджаючы, нібыта «лёгкія» цыгарэты менш шкодныя для здароўя за звычайныя. 7,1 млрд. даляраў пойдзе на кампэнсацыі хворым курцам, 3 млрд. — у бюджэт штату.

СМ, АК; БелаПАН, радыё «Свабода», «Gazeta Wyborcza»

Дзень Волі не задаволіў

IREX-PROMEDIA

25 сакавіка плошчу Якуба Коласа «ачысьцілі» нейкія два дзясяткі амапаўцаў...

Сёлетні Дзень Волі прайшоў як ніколі сьціпла. Нацыянальныя сілы не змаглі дамовіцца ды зладзіць у Менску супольныя акцыі. Партыйных правадыроў памірылі ўлады: лідэры фракцый-канкурэнтак трапілі за адны краты.

Справу зрабілі

Калісьці менавіта Дзень Волі яднаў усіх патрыётаў, цяпер — разьдноўвае. Падрыхтоўка да яго не абышлася без скандалаў. Патэнцыйныя ўдзельнікі акцыяў былі дэзарыентаваныя рознымі датамі, многія ўвогуле адмовіліся ад удзелу.

Улады дзейнічалі прагматычна. Ведаючы пра ўпартае нежаданьне апазыцыі мітынгаваць на Бангалёры і Кульман, яны імкнуліся ня даць гэта зрабіць і ў недазволеных месцах. Яшчэ да пачатку акцый затрымліваліся кіраўнікі й актывісты. Даўно міліцыянты і амапаўцы не адчувалі сябе так упэўнена, як падчас сёлетняга Дня Волі. Нешматлікіх і неарганізаваных мітынгоўшчыкаў яны разганялі плянамерна і малымі сіламі. 25 сакавіка плошчу Якуба Коласа «ачысьцілі» нейкія два дзясяткі амапаўцаў...

Весялейшым атрымалася сьвяткаваньне, якое 23 сакавіка ладзіла каля Галоўпаштамту КХП-БНФ. У ім узяло ўдзел каля 200 чалавек. Жанчыны сьпявалі патрыятычныя песьні, Вячаслаў Сіўчык і Юрась Беленькі давалі інтэрвію, міліцыянты прапаноўвалі мітынгоўшчыкам накіравацца на пляцоўку па вуліцы Кульман і тлумачылі выпадковым мінакам, што ўсё адбываецца з нагоды 85-й гадавіны абвяшчэньня незалежнасьці БНР. Ледзьве калёна рушыла па ходніках, яе спыніў АМАП, які некалькі разоў браў актывістаў у кола і праводзіў затрыманьні. Адбыліся і некалькі сутычак, у выніку якіх дасталося і амапаўцам, адзін зь якіх нават апынуўся на асфальце і атрымаў колькі разоў па нырках.

«Мы своё дело сделали», — сказаў Сіўчык па-расейску нейкаму знаёмаму, адышоўшы ад эпіцэнтру падзеяў. Сабралі людзей, давялі іх да міліцыі і кінулі на волю лёсу. Многіх затрыманых, пасьля здымкаў на відэа і дактыляскапіі, адпусьцілі, папярэдзіўшы, што 25 сакавіка ад 17 да 21-й «у цэнтры гораду вам непажадана быць, інакш пасадзім».

«Памяркоўных» пабралі

25 сакавіка сваё сьвяткаваньне Дня Волі на плошчы Якуба Коласа наладзілі некалькі партый і арганізацый на чале з БНФ «Адраджэньне». Каля 400 чалавек пасьпелі паўдзельнічаць у гэтай акцыі, але многія спазьніліся. Бо мітынг цягнуўся ўсяго некалькі хвілін і складаўся з выступу Вінцука Вячоркі, які павіншаваў прысутных са сьвятам, прапанаваў ускласьці кветкі да помніка Якубу Коласу і разысьціся. Тых, хто не паслухаўся Вячоркі, з плошчы выцінулі амапаўцы. А 18-й усё ўжо было скончана. У пастарунак трапілі 16 чалавек на чале з В.Вячоркам. На паўгадзіны быў затрыманы кіраўнік БСДП (НГ) Мікола Статкевіч, які прысутнічаў зь некалькімі сваімі партыйцамі і на акцыі КХП-БНФ у нядзелю.

Аўторкавы збор на плошчы Якуба Коласа расчараваў ня толькі моладзь (некаторыя маладыя людзі крычалі «Ганьба памяркоўным!»), але і людзей сталых, якія не маглі прыгадаць такога сумнага Дня Волі.

Сьвята за Менскам

Сьвяткаваньне ў Менску было азмрочанае таксама заўчаснай сьмерцю Георгія Таразевіча, старшыні Вярхоўнага Савету БССР у апошнія гады яе існаваньня, нацыянал-камуніста, а пазьней сацыял-дэмакрата, што выявіў сваю палітычную рыцыцповасьць, падаўшы ў адстаўку з пасады пасла ў Польшчы ў знак пратэсту супраць рэфэрэндуму 1995 г.

Мерапрыемствы, што ладзіліся ў Дзень Волі за Менскам, выглядалі нашмат больш сьвяточна, чым сталічныя.

У Берасьці сябры нацыянальнага руху ўскладалі кветкі да магілаў салдатаў Булак-Балаховіча, а пасьля ўдзельнічалі ў сьвяточным уніяцкім набажэнстве. Сябры КХП-БНФ на Савецкай вуліцы раздавалі сваю друкаваную прадукцыю. «Малады фронт» зладзіў міні-футбольны турнір «Кубак Незалежнасьці». Перамагла маладафронтаўская ж каманда «Пагоня», якая ў фінале зь лікам 1:0 выйграла ў дружыны Берасьцейскага тэхнічнага ўнівэрсытэту.

Санкцыяваную ўладамі акцыю зладзілі ў Воршы сябры КХП-БНФ. У ёй узялі ўдзел некалькі сотняў чалавек. У Віцебску сябры АГП ладзілі пікет на прывакзальнай плошчы, і ўсе былі затрыманыя міліцыяй. Затрыманьні працягваліся і падчас акцыі КХП-БНФ ды «Маладога фронту». А шэсьце па горадзе, зладжанае ўвечары 25-га Камітэтам грамадзкіх дзеяньняў, прайшло безь перашкодаў.

У Гомелі ў памяшканьні «Грамадзянскіх ініцыятываў» адбылася сьвяточная імпрэза і канцэрт бардаў. Напярэдадні дырэктар гомельскага гатэлю «Кастрычніцкі» нечакана адмовіў у арэндзе актавай залі, пра што была папярэдняя дамова.

У Маладэчна на сьвята завіталі Кася Камоцкая і гурт «Ліцьвіны». Апроч канцэрту, адбылася выстава мясцовых мастакоў. Былі таксама ўскладзеныя кветкі да помніка «Пакутнікам за волю і незалежнасьць Беларусі».

Такога кшталту акцыі ды імпрэзы зьбіралі людзей і ў іншых гарадах ды мястэчках, але многія беларусы нікуды ня йшлі і сьвяткавалі Дзень Волі дома ці ў гасьцёх.

У Празе беларускія суполкі зладзілі пікет ля амбасады Беларусі, выступаючы супраць інтэграцыі з Расеяй ды патрабуючы спыніць палітычныя рэпрэсіі. Сюжэт пра пасяджаньне Рады БНР — «белорусского правительства в изгнании» — у Празе і кароткае інтэрвію Васіля Быкава паказаў расейскі тэлеканал НТВ.

У Варшаве сьвяточную імпрэзу ладзіла Беларускае аб'яднаньне студэнтаў. Гданьскія беларусы ўшанавалі памяць нацыянальных дзеячоў, пахаваных на мясцовых могілках, найперш дзеяча БНР Лукаша Дзекуць-Малея. Сябры Беларускага культурнага таварыства «Хатка» адкрылі мастацкую выставу. У чацьвер Інстытут беларускай культуры правёў у Варшаве ўрачыстую вечарыну і канцэрт.

Урачысты сход у кавярні Беластоцкага цэнтру культуры распачаўся з супольнага выкананьня гімну «Мы выйдзем шчыльнымі радамі». З дакладам выступіў прафэсар Алег Латышонак: «Калі хтосьці ня ведае, з чаго і адкуль пачалася дзяржава, у якой ён зьяўляецца прэм'ер-міністрам, дык нічога добрага можна не чакаць. Калі б Кебіч адчуваў сябе пераемнікам Язэпа Варонкі — першага прэм'ера БНР, напэўна, так марна ня скончыў бы ў выбарах з Лукашэнкам. Думаю, што і спадар Лукашэнка, які ня ведае, скуль карані дзяржавы, якой ён кіруе, скончыць таксама, як і Кебіч».

У Вільні сьвяткавалі трыма патокамі. Блізкая да беларускага пасольства арганізацыя Лявона Мурашкі зрабіла школьны канцэрт, чым забясьпечыла поўную залю бацькоў. Варожая гэтай арганізацыі суполка Хведара Нюнькі традыцыйна ладзіла стол і прымала Зянона Пазьняка. Тыя ж беларусы, што стаяць па-за канфрантацыяй гэтых дзьвюх суполак, зладзілі сьвяточны малебен у беларускай царкве, усклалі кветкі да магілы К.Каліноўскага і паслухалі канцэрт Валянціны Кавальчук і Зьмітра Бартосіка.

Вучыцца сьвяткаваць

Вулічныя акцыі безумоўна патрэбныя. Найперш для тых людзей, якія пра БНР могуць пачуць хіба з навінаў НТВ. Сьвяткаваньне ў залях ды офісах («рэзэрвацыях» альбо «выспах свабоды», каму што падабаецца) не дае такога прапагандысцкага эфэкту ў грамадзтве, як вулічныя акцыі. Дадамо: як акцыі добра прадуманыя, арганізаваныя і як сьлед праведзеныя. Пра менскія падзеі 23 і 25 сакавіка гэтага ня скажаш. Таму трэба вучыцца сьвяткаваць нашае найвялікшае нацыянальнае сьвята.

Сяргей Ёрш

ХРОНІКА ЎЦІСКУ

6 сакавіка за раздачу ўлётак з заклікам прыняць удзел у Народным маршы «За лепшае жыцьцё!» ў Барысаве былі затрыманыя актывісты незарэгістраванага руху «Зубр» 15-гадовыя Марыя Піліпенка і Зьміцер Шматок. 13 сакавіка за арганізацыю згаданага маршу на 15 сутак былі асуджаныя Андрэй Саньнікаў, Людміла Гразнова, Зьміцер Бандарэнка і Леанід Малахаў. 17 сакавіка за ўдзел у маршы міліцыя затрымала Юр'я Хадыку каля ягонага дому. Выпісаны ордэр на ягоны адміністрацыйны арышт, ён хаваецца ад затрыманьня. 21 сакавіка ў пастарунку апынуўся сябра КХП-БНФ Аляксей Лапенка, які расклейваў улёткі да Дня Волі ў Менску. 23 сакавіка падчас акцыі, прысьвечанай 85-м угодкам БНР, у Горадні былі арыштаваныя два Сяргеі Мальчыкі — старшыня абласной філіі БНФ і ягоны стрыечны брат, а таксама Мікалай Яўсей і Зьміцер Антаневіч. У Менску 23 сакавіка падчас «хапуну» ў міліцыю трапілі: Павал Знавец (пасадзілі на 10 сутак), Аляксей Кароль, Натальля Васілевіч (атрымала папярэджаньне), Сяргей Папкоў (аштрафаваны на 20 базавых адзінак), Вячаслаў Сіўчык (атрымаў 15 сутак), ягоная жонка Ганна і 6-гадовы сын Вітаўт, Зьміцер Касьпяровіч, Павал Севярынец (затрыманы прэвэнтыўна перад пачаткам акцыі, асуджаны на 10 сутак), Дзяніс Чыкалёў, Алег Мядзьведзеў (10 сутак), праваслаўны сьвятар Аляксандар Шрамко (папярэджаньне), сп.Рак (папярэджаньне), Леанід Дзейка (20 б.а. штрафу), Алег Сагадзін (папярэджаньне), Валянцін Баранаў (14 сутак арышту), сп.Балак, Зьміцер Філіповіч (15 сутак), Юрась Фабішэўскі (10 сутак), Уладзімер Юхо (7 сутак), Аксана Новікава (папярэджаньне), Тацяна Сандовіч (папярэджаньне), Натальля Валакіда (журналістка газэты «Згода», адпусьцілі, калі паказала пасьведчаньне), Анатоль Рыбкавец (30 б.а. штрафу), Дзяніс Дашкевіч (3 сутак), Сьвятлана Ніколенка (папярэджаньне), сп.Мяцільскі, аўтар «НН» Зьміцер Галка (20 б.а. штрафу), Мікалай Стоцік (гэткі самы штраф), сп.Савіч, Аляксей Шэін (карэспандэнт БелаПАН, быў адпушчаны пасьля паказваньня пасьведчаньня), Віталь Кошалеў (меў пасьведчаньне назіральніка), Аляксандар Прушынскі, Юрась Беленькі, Генадзь Дранковіч, Сяргей Высоцкі, Алег Гнедчык, Дзяніс Трубко, Максім Ляховіч, Павал Селязьнёў, Уладзімер Селязьнёў, Зьміцер Гурво, Алесь Яскалевіч, Алег Радзюк, Фёдар Бешанкоў, Анатоль Рабкавец (штраф у 30 б.а.), Васіль Парфянкоў, Іра Вяткіна, Арцём Мірдовіч, Васіль Белан, Алег Корбан, Пятро Сакольчык, Віктар Гара, Леанід Валуй, Вольга Дайнека, Валер Гебянёў, Валянцін Малышка (5 сутак), Кастусь Міронаў (20 б.а. штрафу). 25 сакавіка быў арыштаваны каардынатар незарэгістраванага руху «Зубр» Цімох Дранчук, які прыйшоў да менскага прыёмніка-разьмеркавальніка на вул.Акрэсьціна перадаць газэты арганізатарам маршу «За лепшае жыцьцё!». Падставай для арышту стаў завочны судовы прысуд на 10 сутак за ўдзел у сьвяткаваньні Дня Волі ў 2002 г. У той самы дзень у сталіцы да пачатку сьвяткаваньняў у пастарунак прэвэнтыўна трапілі Зьміцер Бародка і Леанід Навіцкі. Пасьля акцыі міліцыя затрымала кіраўніка БСДП (НГ) Міколу Статкевіча (быў неўзабаве выпушчаны), кіраўнікоў Партыі БНФ Вінцука Вячорку і Ўладзімера Кішкурну, маладафронтаўцаў Алега Корбана (якога затрымлівалі і 23-га), Максіма Гаўрыловіча, Віталя Апацкага, Аляксея Рабіцкага, Сяргея Дземіша, Васіля Ермакова, «зуброўцаў» Яўгена Афнагеля, Ігара Віньнікава, Тацяну Елавую, Дзяніса Дашчынскага, Сяргея Буяўца. 26 сакавіка Я.Афнагель і У.Кішкурна былі асуджаныя на 15 сутак арышту, па 5 сутак арышту атрымалі Т.Елавая, Л.Навіцкі, І.Віньнікаў, А.Корбан, З.Бародка (яго абвінавацілі ў хуліганстве), В.Вячорка — на 10 сутак. У Віцебску падчас сьвяткаваньня Дня Волі затрыманыя сябры АГП Эла Канавалава, Іна Сяткоўская, Вольга Саўчанка, Валер Грыгаровіч, Аляксей Нікановаў, Уладзімер Семянчукоў, Сяргей Фахрутдзінаў, сябры КХП-БНФ Уладзімер Плешчанка і Аляксандар Салаўян, Барыс Хамайда, маладафронтаўцы Віктар Шляхцін, Алесь Гайдукоў і Зьміцер Казакевіч, прадстаўнікі Праваабарончага цэнтру «Вясна» Ўладзіслаў Токараў, Зьміцер Найверт, Канстанцін Горын і Яўген Даманюк, а таксама карэспандэнт радыё «Палёнія» Юрась Сьцяпанаў.

АВ

Беларускі бок хвалюе лёс экспартных кантрактаў з Іракам, а таксама абяцаныя інвэстыцыі з арабскіх фондаў.

Вайна з партнэрам

«Дынамічна разьвівалася нашае эканамічнае супрацоўніцтва», — казаў пра Ірак Лукашэнка ў сваім тэлезвароце. І праўда: у гутарках пра ранейшыя гаспадарчыя адносіны Іраку і Беларусі цяпер больш выпадае карыстацца дзеясловамі мінулага часу. Неўзабаве ў Багдадзе зьявяцца новыя гаспадары. Як гэта адаб'ецца на беларускай гаспадарцы?

Цяпер ва ўладзе ў ЗША знаходзіцца геаэканамічная каманда, што прыйшла зь вялікага карпаратыўнага бізнэсу. Генэральны віцэ-прэзыдэнт Дзік Чэйні з 1995 г. узначальваў адну з найбуйнейшых кампаніяў ЗША «Halliburton» (абсталяваньне для нафта- і газаздабычы, інтарэсы ў ВПК); міністар фінансаў Пол О'Ніл кіруе самым буйным у сьвеце вытворцам алюмінію «Alcoa Inc» (30% сусьветнай вытворчасьці); міністар абароны Дональд Рамсфэльд цягам 23 гадоў узначальваў буйныя кампаніі ў сфэры фармацэўтыкі і тэлеіндустрыі; дарадца прэзыдэнта ЗША па нацыянальнай бясьпецы Кандаліза Райс мае досьвед працы ў сфэры стратэгічнага ядравага плянаваньня і інтарэсы ў нафтавых кампаніях; дзяржсакратар Колін Паўэл — генэрал, адзін з стваральнікаў пляцдарму для абароны энэргетычных інтарэсаў ЗША ў Пэрсыдзкай затоцы.

Амэрыканская замежная палітыка знаходзіцца ў руках карпаратыўных інтарэсаў. ЗША зробяць усё, каб павялічыць прыбыткі, якія яны атрымаюць па сканчэньні вайны, ды зьменшыць выдаткі. Дж.Буш ужо падаў у Кангрэс абгрунтаваньне на выдаткі ў памеры 75 млрд. даляраў. Значыцца, будзе зроблена ўсё, каб паменшыць магчымасьці іншых краінаў атрымаць эканамічныя выгоды як на нафтавым рынку, так і ў пастаўках прадукцыі на пасьляваеннае аднаўленьне Іраку.

Экспарт

Эканамічны ўплыў вайны ў Іраку на Беларусь можна разглядаць у трох галоўных кірунках. Па-першае, лёс экспартных кантрактаў (як ужо падпісаных, так і новых, зьвязаных з паваенным аднаўленьнем Іраку). Падругое, сытуацыя на паваенным нафтавым рынку. І па-трэцяе, прыцягненьне раней абяцаных інвэстыцыяў з арабскіх фондаў.

Беларускі экспарт у Ірак нязначны, але ён даволі дынамічна разьвіваўся. Так, у 1995—97 г. яго не было наагул, у 1998 г. ён склаў 5,5 млн. даляраў, у 2000 г. — 7,8 млн. даляраў, у 2002 г. — каля 32 млн. даляраў. Асноўныя яго артыкулы — прадукцыя машынабудаваньня: трактары (1500 штук за 2000—2002 г.), шасі і прычэпы (400—500 у 2001—2002 г.), рухавікі (450 летась). Разьвіцьцё экспарту стрымліваюць санкцыі ААН, якія не дазваляюць рэалізаваць падпісаныя між Беларусяй ды Іракам кантракты на 300 млн. даляраў. А гэта 3,7% леташняга экспарту Беларусі. Рэалізацыя гэтага патэнцыялу малаверагодная. Цяжка спадзявацца і на экспарт, напрыклад, беларускіх будаўнічых матэрыялаў, бо ЗША будуць намагацца аднаасобна выкарыстаць пасьляваенны рост попыту на абсталяваньне для нафтаздабычы, на будматэрыялы, сродкі транспарту і г.д.

Нафтавы рынак

Беларусь нафту імпартуе па сусьветных цэнах, не зацікаўленая ў іх падвышэньні і залежыць ад стабільнасьці на энэргарынках. З пачатку 2002 г. і да пачатку вайны сярэдняя цана на нафту вырасла да 38 даляраў за барэль. Але ў першыя дні яна паменшала да 27 даляраў. Для эканомікі ЗША выгадна, калі нафта каштуе каля 25 даляраў за барэль. Гэта значыць, што цэны стабілізуюцца блізка каля гэтага ўзроўню, інакш вайна для ЗША будзе фінансава неапраўданай. Іншае пытаньне, колькі часу спатрэбіцца для стабілізацыі цэнаў.

Першая вайна ў Пэрсыдзкай затоцы сьведчыць, што на аднаўленьне сьвідравінаў спатрэбілася 1,5—2 гады. Гэтулькі ж, максымум, спатрэбіцца і гэтым разам. Таму, пакуль здабыча нафты ня выйдзе на даваенны ўзровень, краіны OPEK будуць павялічваць яе экспарт. Расея ўжо дамовілася з OPEK аб павелічэньні здабычы на 0,5 млн. барэляў у суткі (гэта чвэрць ад таго, што здабываў Ірак перад вайною). Але магутнасьці Расеі па транзыце дадатковага экспарту абмежаваныя. Таму павялічыцца загрузка беларускіх нафтаперапрацоўчых заводаў з мэтай экспарту прадуктаў нетрубаправодным транспартам. Гэта можа актывізаваць прыватызацыю двух беларускіх НПЗ, тым больш што прыкладна 40% акцыяў Мазырскага заводу знаходзіцца ва ўласнасьці расейцаў. Дадатковы струмень нафтадаляраў у Расею можа справакаваць пашырэньне попыту на беларускія тавары.

Інвэстыцыі

Сытуацыя з арабскімі інвэстыцыямі ў Беларусь (напрыклад, дамоўленасьць з Кувэйцкім фондам аб інвэстыцыях у электраэнэргетыку і хімічную прамысловасьць) будзе залежаць ад ступені разбурэньняў на Арабійскім паўвостраве падчас вайны. Калі дамоўленасьці аб інвэстыцыях і застануцца ў тых жа памерах, то, прынамсі, верагоднае іх запаволеньне.

Такім чынам, у эканамічным пляне ўплыў вайны ў Іраку на Беларусь будзе хутчэй адмоўным. Гэта будзе вызначацца тым рэжымам, які прыйдзе пасьля вайны. Але афіцыйная пазыцыя Беларусі ў адносінах да вайны ў Іраку дае магчымасьць атрымаць пэўныя палітычныя дывідэнды на эўрапейскай прасторы. І гэтыя дывідэнды могуць ператварыцца ў эканамічныя плюсы.

Уладзімер Валетка, эканаміст

ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

Адзінай валюты не прадбачыцца

Аляксандар Лукашэнка сустрэўся з старшынём Нацбанку Пятром Пракаповічам. І запатрабаваў дабіцца максымальнага патаньненьня крэдытаў для «рэальнага сэктару эканомікі». Таксама была гаворка пра супольную валюту. Мяркуючы па інфармацыі БелТА, кіраўнік дзяржавы паставіў задачу не ісьці на саступкі Расеі ў гэтым пытаньні.

Крэдыт для МАЗу

МАЗ атрымаў падатковы крэдыт на 38 млрд. 388 млн. рублёў і субсыдыі на 18 млрд. 605 млн. рублёў. Летась завод пачаў рабіць грузавікі паводле экалягічных стандартаў Эўра-1 і Эўра-2, якія вызначаюць узровень шкодных выкідаў рухавіка. 80% прадукцыі МАЗу экспартуецца ў Расею, дзе ўжо не дазваляюць рэгістраваць машыны старога стандарту Эўра-0. Грошы спатрэбіліся, каб утрымаць цэны на старым узроўні і захаваць сваю долю на расейскім рынку, бо новыя грузавікі маюць вышэйшы сабекошт. МАЗ мусіць аддаць крэдыт да 2005 г.

Страйкоўцаў пазбаўляюць ліцэнзіяў

16 індывідуальных прадпрымальнікаў з Салігорску пазбавілі ліцэнзіяў. Афіцыйная фармулёўка — «паводле вынікаў праверак санэпідэмстанцыі». Самі бізнэсоўцы лічаць, што гэта пакараньне за ўдзел у страйку 12 сакавіка. Іншых прадпрымальнікаў Салігорскі гарвыканкам прымушае здаваць грошы на набыцьцё сыстэмы відэанагляду за горадам.

«Наруцянка» насьвінячыла

Пракуратура зацікавілася дзейнасьцю сумеснага беларуска-чэскага прадпрыемства «Наруцянка». Тры гады таму яно ўзяло ў арэнду сьвінагадоўчы комплекс калгасу «Савецкі», што на Пружаншчыне. Парсюкоў гадавалі, эканомячы на ачышчальных сыстэмах, адкіды зьлівалі ў навакольныя вадаёмы. Уладальнікам сьвінакомплексу загадалі навесьці парадак, але штрафаў ня выпісалі.

Ільняная круцялі

Частка кіраўніцтва Полацкага льнозаводу трапіла пад суд за службовы падлог. Паводле бухгальтарскіх справаздачаў, працаўнікі заводу атрымлівалі заробак ільноваланком. Насамрэч плацілі грашыма, а лён сьпісвалі і прадавалі камэрсантам па вышэйшых цэнах.

Стаўка рэфінансаваньня зьніжаная

З 21 сакавіка Нацбанк зьнізіў стаўку рэфінансаваньня да 37% гадавых. Да гэтага яна была роўнай 38%, што крыху перавышала рост спажывецкіх цэнаў. Ад зьніжэньня стаўкі згубяць тыя, хто трымае ўклады ў беларускіх рублях, а выйграюць тыя, хто атрымаў рублёвыя крэдыты, працэнт па якіх роўны стаўцы рэфінансаваньня.

Адлоў аграрнікаў

Як і штовесну, 26 сакавіка Міністэрства ўнутраных справаў пачало спэцапэрацыю «Аграрнік». «Мэта апэрацыі — папярэджаньне і спыненьне парушэньняў закону ў аграпрамысловасьці, забесьпячэньне захаванасьці насеннага фонду, сельскагаспадарчай тэхнікі, паліўнаэмазачных матэрыялаў, атрутаў, хімікатаў і ўгнаеньняў», — паведамляе МУС.

АК

Джынджыч: аўтапсія аднаго забойства

Забойства прэм'ера Сэрбіі стала шокам для ўсходнеэўрапейскіх палітыкаў. Ці азначае яно, што палітычныя перамены ў Беларусі таксама немагчымыя без супрацоўніцтва дэмакратаў з крыміналам?

Прэзыдэнт Каштуніца быў візытоўкай сэрбскай рэвалюцыі, Джынджыч — яе рухавіком. Доктар філязофіі, выпускнік нямецкіх унівэрсытэтаў, ён вярнуўся на радзіму, каб стварыць Дэмакратычную партыю і стаць адным зь лідэраў вулічных пратэстаў 1996 г., а пасьля — мэрам Бялграду. Скінуты з пасады ў выніку здрады Вука Драшкавіча, ён ня зьехаў на эміграцыю. Палкі тэмпэрамэнт дапамог Джынджычу захаваць аўтарытэт, нават калі дзяржаўная прапаганда абвінавацілі яго ў дэзэрцірстве — падчас NATOўскіх налётаў Джынджыч не падпарадкаваўся загаду аб усеагульнай мабілізацыі. Ён пераседзеў бамбёжкі ў Чарнагорыі, апраўдваючыся, што «ў войску Мілошавіч падстроіў бы маё забойства». Аднак памерці Джынджычу судзілася інакш.

Прэм'ер пакутліва рухаўся на мыліцах ад машыны да дзьвярэй будынку ўраду, калі яго прадзіравілі тры снайпэрскія кулі.

Джынджыч увойдзе ў гісторыю як палітык, што распачаў паварот Сэрбіі да Эўропы. Але ён ня быў палітыкам з зусім чыстымі рукамі. Дый ці магчыма такое ў Югаславіі, дзе дэмакраты мусілі мабілізаваць усе сілы, якія толькі маглі выступіць супраць Мілошавіча? «Даводзілася мець сяброў ня толькі ў раі, але і ў пекле», — прызнаваўся сам Джынджыч. Ён загінуў, калі паспрабаваў разарваць дамову з «д'яблам», — такую вэрсію вылучае сэрбская прэса.

Каб выжыць ва ўмовах міжнароднай ізаляцыі, Мілошавіч вымушаны быў парушаць міжнародныя санкцыі, што прывяло да ўзьнікненьня крыміналізаванай алігархіі. Сувязі між палітыкамі, злачынным сьветам, бізнэсам і «органамі» ў Сэрбіі дасягнулі небясьпечных памераў. Палітычнае жыцьцё пачало нагадваць барацьбу мафіёзных кланаў. Таямнічыя забойствы зрабіліся неад'емным элемэнтам палітычнага краявіду.

У студзені 2000 г. пры нявысьветленых акалічнасьцях быў забіты Жэлька «Аркан» Ражнятавіч, «герой» вайны ў Босьніі. Пасьля былі два няўдалыя замахі на Вука Драшкавіча (у адным зь іх загінулі чатыры Драшкавічавы ахоўнікі). Нарэшце, зьнік падчас ранішняй прабежкі ў парку Іван Стамбаліч, былы прэзыдэнт Сэрбіі.

Палкоўнік з «эскадрону сьмерці»

Пасьля забойства Джынджыча сэрбскі ўрад надзіва апэратыўна абвясьціў, што галоўнымі замоўцамі былі палкоўнік Міларад Лукавіч па мянушцы «Легіён» і Душан Спасоевіч па мянушцы «Шыптар» (зьняважлівая мянушка для альбанцаў). Лукавіч у 1998—2001 г. быў начальнікам брыгады спэцпрызначэньня (БСП), ці «чырвоных барэтаў». У маладосьці ён разам зь сябрукамі нападаў на крамы. Пасьля чарговага нападу ўцёк на Захад, дзе ў 80-х служыў у «Замежным легіёне». Адсюль і мянушка. Вярнуўся на радзіму ў пачатку 90-х і далучыўся да ўтворанай «Арканам» Сэрбскай добраахвотнай гвардыі (СДГ).

Палкоўнік Міларад Лукавіч.

Пасьля вайны ў Босьніі Лукавіч перайшоў у БСП, служыў у Косаве. У кастрычніку 1998 г. ён атрымаў званьне палкоўніка і ачоліў брыгаду, якая здабыла сумную славу Мілошавічавага «эскадрону сьмерці».

У кастрычніку 2000 г. пасьля прэзыдэнцкіх выбараў сотні тысяч чалавек выйшлі на вуліцы Бялграду, каб прымусіць Мілошавіча прызнаць вынікі кампаніі. Дэманстрантаў можна было разагнаць, ужыўшы зброю. Аднак БСП рабіць гэтага ня стала.

Дамова з «д'яблам»

Мірнаму вырашэньню паспрыяла размова Джынджыча з Лукавічам. Першы пазьней шмат разоў падкрэсьліваў: «Многія абавязаны «Легіёну» жыцьцём, у тым ліку і я». Палкоўніку, відаць, паабяцалі амністыю за ранейшыя злачынствы. Лукавіч застаўся начальнікам «чырвоных барэтаў». Ён быў адхілены ад пасады ў траўні 2001 г., калі выклікаў «задымленьне» ў дыскатэцы, якое скончылася пажарам. Месяцам пазьней Лукавіч справакаваў страляніну ў начным клюбе падчас сьвяткаваньня дня нараджэньня ўдавы «Аркана» Сьвятланы Ражнятавіч («Цэцы»), зоркі сэрбскае папсы. Тады ўжо яго канчаткова звольнілі, але справу-такі «замялі».

Лукавіч захаваў уплыў у БСП, яе начальнікам зрабіўся ягоны намесьнік Міларад Брацянавіч. «Легіён» быў завадатарам бунту «чырвоных барэтаў» у лістападзе 2001 г. Спэцназ стаў на дыбкі, калі Карла Дэль Понтэ прывезла ў Бялград сьпіс з 200 асобаў, што мусілі паўстаць перад Гаагскім трыбуналам. Там было і Лукавічава прозьвішча.

18.20 «Проста мама». Дак. фільм цыклу «Агульны дом».
20.05 «Гульнявы рэфлекс».
20.15 «Добры вечар, маленькі...».
20.50 Кіно: баявік «Азартныя гульні». ЗША, 2000.
23.05 «Навіны СНД».
23.20 Дак. фільм «Бязь вестак зьніклы».
0.10 Ілюзіён. Драма «Гордасьць і прадузятасьць». ЗША.

● Першы музычны канал

7.00 «Пад'ёмнік». Інфармацыйна-забаўляльная праграма ў жывым этэры.
9.00, 16.00 Рухач.
14.00 «ІнтэрАктыў».
17.00, 22.10 УльтраМікс.
22.00 «120/80».
22.30 «Пра Fashion». Модная праграма.
23.15, 2.00 МэгаМікс.
1.00 «Чарнасьліў». Культуралягічнае шоў.

● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.00 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.00 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 Дэтэктыў «Тайна Карыбскай затокі». 2-я сэрыя.
10.45, 23.15 «Фабрыка зорак-2».
11.15 Дыснэй-клюб: «Лойд у космасе».
15.15 «Новы дзень». «Каралі сьмеху».
15.40 «Новы дзень». «Вялікія містыфікацыі».
16.10 Камэдыя «Кранутыя». 2-я сэрыя.
17.05 «Вялікае мыцьцё».
18.10 Незалежнае расьсьледаваньне.
20.00 Час.
21.00 «Слабае зьвяно».
22.00 Шматсэрыйны фільм «Іншае жыцьцё».
23.45 Сэрыял «Уцякач».

● РТР

9.40, 18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
10.20 «Кароткае замыканьне». Ток-шоў.
17.50 «Камісар Рэкс». Тэлесэрыял.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
19.55 Сэрыял «Расейскія Амазонкі».
21.00 Прэм'ера. Сэрыял «Кобра. Антытэрор». Фільм 6-ы. «Гнеў».
22.00 Ток-шоў «Весткі+».
22.30 Весткі — спорт.
22.40 Вячэрні сэанс. Маст. фільм «Няма дарогі назад» (ЗША). 1996 г.

● НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.15 Надвор'е на заўтра.
9.20 «Увага. Вышук!».
10.00, 11.00, 15.00, 16.00, 17.00 Сёньня.
10.05 «Расьліннае жыцьцё».
10.35 Вы будзеце сьмяяцца!
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.10, 19.50 Сэрыял «Бандыцкі Пецярбург: арыштант».
17.20 Шчырае прызнаньне.
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35, 22.25 Прэм'ера-2003. Сэрыял «Пяты анёл».
21.00 «Краіна і сьвет». Галоўныя падзеі дня.
21.40 Сэрыял «Сэкс у вялікім горадзе» (ЗША).

● Культура

15.10 Магія кіно.
15.40 Да юбілею актрысы. «Тэатральны летапіс XX стагодзьдзя». Эліна Быстрыцкая. Разьдзел 2-і.
16.05 Клясыкі сучаснага мастацтва. Марлен Шпіндлер.
16.35 Дзень яднаньня народаў Беларусі і Расеі. «Кінарэжысэр Барыс Сьцяпанаў». «Я тут жыву». Дак. фільмы.
17.30 Весткі.
17.40 Навіны культуры.
17.55 Да 130-годзьдзя з дня нараджэньня С.Рахманінава. «Айчына і лёсы».
18.35 С.Рахманінаў. Канцэрт №2 для фартэпіяна з аркестрам.
19.15 «Расейскі сьлед у Баварыі». «Прагулкі зь Цютчавым».
19.40 «Дапамажыце Тэлеку».
19.50 «Медзьвяжудасьць». Мультфільм.
20.00 «Рэжысэр Андрэй Таркоўскі». Дак. фільм.
21.40 «Апокрыф».
22.20 «Астравы».
23.00 «Навіны культуры» з Уладзіславам Фляркоўскім.
23.25 «Начны палёт».

● Эўраспорт

9.30 Футбол. Чэмпіянат Эўропы. Эўра-2004. Кваліфікацыя. Паўтор.
11.30 Футбол. Паўтор.
12.00 Часопіс WATTS. Паўтор.
12.30 Экстрэмальныя віды спорту. Зімовыя віды. Паўтор.
13.30 Снаўборд.
14.00, 15.00, 16.00, 17.00 Футбол. Чэмпіянат Эўропы. Эўра-2004. Кваліфікацыя. Паўтор.
19.15 Фігурнае катаньне. Чэмпіянат сьвету. Вашынгтон. Паказальныя выступы. Паўтор.
21.00 Конны спорт. Кубак сьвету. Гётэбарг.
22.00 Гольф. US PGA. Спэцагляд.
23.00 Алімпійскі часопіс.
23.45 Футбол. Чэмпіянат Эўропы-2004. Адборачныя матчы. Агляд.

3 красавіка чацьвер

● БТ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.10, 7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.10 Кароткамэтражны маст. фільм паводле гумарыстычных апавяданьняў А.Чэхава «Тэатральныя гісторыі».
9.10 «Рыцарскі раман». Сэрыял. 3-я сэрыя, заключная.
10.05 «Сьвятло далёкай зоркі. Міхаіл Пташук». Аўтарская праграма Аляксандра Дамарацкага.
10.30 «Касьняпэя». Пазнавальны сэрыял.
10.55 Наша спадчына. Нэаклясычныя сядзібы Беларусі.
11.10, 21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
12.15, 14.35 Добры дзень, Беларусь!
13.05 Камэдыя «Афоня».
15.15 «Самая кепская ведзьма». Сэрыял для дзяцей.
15.40 Пяць цудаў.
15.50 «Гэта клясна!». Сэрыял.
16.20 5х5.
17.00 Кліп-абойма.
17.05 «Залаты голас». Сэрыял. 1-я сэрыя.
18.15 «Лінія абароны». Сэрыял. 1-я сэрыя.
19.10 Драма «Тунэль» (Германія). 1-я сэрыя.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.50 Зона Ікс.
23.15 Начны этэр.
0.15 Сацыяльная драма «Час лёкаяў».

● СТВ

5.00 Музычны канал.
5.30 «Біттлборгі». Тэлесэрыял.
5.55, 15.55 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.20, 15.25 «Джым Батан». Мультсэрыял.
6.50, 15.00 «Новы экшэнмэн». Мультсэрыял.
7.15, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.25, 13.30, 16.30, 19.30, 22.35 «24 гадзіны».
7.45, 19.50 «СТВ-спорт».
7.55 «Тэма дня».
8.05, 22.55 «Тэхналёгія».
8.15 Кіно: баявік «Азартныя гульні». ЗША, 2000.
10.00 Дак. фільм.
10.30, 20.05 «Гульнявы рэфлекс».
10.40 «Пад вуглом 23 з паловай». Дак. фільм.
11.05 «Партрэт у інтэр'еры».
11.20, 20.35 «Фільм, фільм, фільм».
11.35 «Віно каханьня». Тэленавэла.
12.25 «Вар'яцкі сьвет». Дак. фільм.
12.55 «Агенцтва». Камэдыйны сэрыял.
13.50, 18.40 «Круты Ўокер». Тэлесэрыял.
14.35 «ЗБЖ, ці...». Тэлесэрыял.
16.45 «Дружная сямейка». Камэдыйны сэрыял.
18.05 «Тэатральныя гісторыі».
18.20 «Рамонт».
20.15 «Добры вечар, маленькі...».
20.50 Кіно: камэдыя «Дзевяць ярдаў». ЗША, 2000.
23.05 «Навіны СНД».
23.20 «Навіны сусьветнай шоў-індустрыі».
23.50 Кіно: камэдыя «Мяжа мрой». ЗША, 1999.

● Першы музычны канал

7.00 «Пад'ёмнік». Інфармацыйна-забаўляльная праграма ў жывым этэры.
9.00 «120/80».
9.10, 16.00 Рухач.
14.00 «ІнтэрАктыў».
17.00 УльтраМікс.
23.00 МэгаМікс.

● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.00 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50, 22.00 Шматсэрыйны фільм «Іншае жыцьцё».
10.40, 23.15 «Фабрыка зорак-2».
11.10 Дыснэй-клюб: «Баз і яго каманда».
15.15 «Новы дзень». Ударная сіла. «Бескантактная вайна».
15.40 «Новы дзень». «Расейскі экстрым».
16.10 Камэдыя «Кранутыя». 3-я сэрыя.
17.05 «Вялікае мыцьцё».
18.10 «Жарт за жартам».
20.00 Час.
21.00 «Асноўны інстынкт».
23.45 Трылер «Піраны». ЗША, 1978 г.

● РТР

8.40 Сэрыял «Кобра. Антытэрор». Фільм 6-ы. «Гнеў».
9.40, 18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
10.20 «Кароткае замыканьне». Ток-шоў.
17.50 «Камісар Рэкс». Тэлесэрыял.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
19.55 Сэрыял «Расейскія Амазонкі».
21.00 Прэм'ера. Сэрыял «Кобра. Антытэрор». Фільм 7-ы. «Талінскі экспрэс».
22.00 Ток-шоў «Весткі+».
22.30 Весткі — спорт.
22.40 Кінаакадэмія. Прэм'ера. Фільм Лона Шэрфіга «Італьянская для пачаткоўцаў» (Данія). 2001 г.

● НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 Шчырае прызнаньне.
10.00, 11.00, 15.0, 16.00, 17.00 Сёньня.
10.05 «Кватэрнае пытаньне».
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.10, 19.50 Сэрыял «Бандыцкі Пецярбург: арыштант».
17.20 «Вочная стаўка». «Рытуальнае забойства».
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35, 22.15 Прэм'ера-2003. Сэрыял «Пяты анёл».
21.00 «Краіна і сьвет». Галоўныя падзеі дня.
21.40 Сэрыял «Сэкс у вялікім горадзе» (ЗША).

● Культура

15.15 «Графаман».
15.45 «Тэатральны летапіс XX стагодзьдзя». Эліна Быстрыцкая. Разьдзел 3-і.
16.10 «Пецярбург: Час і месца». Расейскі этнаграфічны музэй.
16.40 «Проста жыцьцё». «Кландайк». Дак. фільмы.
17.30 Весткі.
17.40 Навіны культуры.
17.55 Памяці Паўла Лебешава. «Мяне прыдумалі кінакрытыкі...»
18.25 Да 130-годзьдзя з дня нараджэньня С.Рахманінава. Канцэрт №3 для фартэпіяна з аркестрам.
19.15 «Расейскі сьлед у Баварыі». «Што рабіць?»
19.40 «Ахвярапрынашэньне». Маст. фільм. Рэжысэр А.Таркоўскі.
22.05 «Культурная рэвалюцыя».
23.00 «Навіны культуры» з Уладзіславам Фляркоўскім.
23.25 «Начны палёт».

● Эўраспорт

9.30 Гольф. US PGA. Спэцагляд. Паўтор.
10.30 Конны спорт. Кубак сьвету. Гётэбарг. Паўтор.
11.30 Снаўборд. Этап кубку сьвету. Паўтор.
12.00 Футбол, Чэмпіянат Эўропы-2004. Адборачныя матчы.
17.00 Футбол, Чэмпіянат Эўропы-2004. Адборачныя матчы. Паўтор.
19.15 Футбол. Кубак Лібэртадорэс. Дзень 9-ы. Лібэртад — Рывэр Плэйт.
21.15 Футбол, Чэмпіянат Эўропы-2004. Адборачныя матчы. Агляд.
0.00 Бокс. Паўтор.

4 красавіка
пятніца

● БТ

6.00, 7.00, 8.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.10, 7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.10, 18.15 «Лінія абароны». Сэрыял.
9.10, 17.00 «Залаты голас». Сэрыял.
10.00 Сад мары. Перадача для дачнікаў.
10.25 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
10.55 Кухня КВК.
11.05, 21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
12.15, 14.35 Добры дзень, Беларусь!
13.05 Камэдыя «Ты — мне, я — табе».
15.15 «Самая кепская ведзьма». Сэрыял для дзяцей.
15.40 Пяць цудаў.
15.50 «Гэта клясна!». Сэрыял.
16.20 5х5.
19.10 «Тунэль». Маст. фільм. 2-я сэрыя.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.50 Зона Ікс.
23.15 Прэм'ера. Драма «Вас не дагоняць» (Канада).

● СТВ

5.00 Музычны канал.
5.30 «Бітлборгі». Тэлесэрыял.
5.55, 15.55 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.20, 15.25 «Джым Батан». Мультсэрыял.
6.50, 15.00 «Новы экшэнмэн». Мультсэрыял.
7.15, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.25, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
7.45, 19.50 «СТВ-спорт».
7.55 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
8.00, 18.15 «Менск і менчукі».
8.05, 22.50 «Тэхналёгія».
8.15 Кіно: камэдыя «Дзевяць ярдаў». ЗША, 2000.
10.00 Дак. фільм.
10.20 «Гульнявы рэфлекс».
10.30 «Запрашаем паскардзіцца».
10.40 «Пад вуглом 23 з паловай». Дак. фільм.
11.05, 20.35 «Аўтапанарама».
11.20 «Тэатральныя гісторыі».
11.35 «Віно каханьня». Тэленавэла.
12.25 «Вар'яцкі сьвет». Дак. фільм.
12.55 «Агенцтва». Камэдыйны сэрыял.
13.50, 18.40 «Круты Ўокер». Тэлесэрыял.
14.35 «ЗБЖ, ці...». Тэлесэрыял.
16.50 «Мэдыкі». Камэдыйны сэрыял.
18.05 «Філярманічны тыдзень».
18.10 «Сьвецкая хроніка».
18.25 «Тэма дня».
20.00 «Рэактыўны бокс».
20.15 «Добры вечар, маленькі...».
20.50 Кіно: трылер «Вузкая мяжа». ЗША, 1990.
23.00 «Навіны СНД».
23.15 Кіно: «чорная» камэдыя «Жахі ў сьне і на яве». Канада, 2000.

● Першы музычны канал

7.00 «Пад'ёмнік». Інфармацыйна-забаўляльная праграма ў жывым этэры.
9.00, 16.00 Рухач.
14.00 «V.I.P.онія».
17.00, 22.10 УльтраМікс.
22.00 «120/80».
22.30 «20-ка Першых».
23.30 МэгаМікс.

● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.25 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 Шматсэрыйны фільм «Іншае жыцьцё».
10.40, 22.05 «Фабрыка зорак-2».
11.10 Сэрыял «Твінісы».
15.15 «Новы дзень». «Містычны Балі».
15.40 «Новы дзень». Ударная сіла. «Зброя XXI стагодзьдзя».
16.10 Камэдыя «Крануты». 4-я сэрыя, заключная.
17.05 «Вялікае мыцьцё».
18.10 «Самі з вусамі».
18.40 Дэтэктыў. «Гераінавы дзед». Справа 2003 г.
20.00 Час.
21.00 «Поле цудаў».
23.40 Баявік «Дрыжаньне зямлі: Вяртаньне пачвараў».

● РТР

8.40, 21.00 Сэрыял «Кобра. Антытэрор». Фільм 7-ы. «Таліньскі экспрэс».
9.40, 18.50 Весткі. Дяжэурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
10.20 У пошуках прыгод.
17.50 Аншлаг.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
19.55 Сэрыял «Расейскія Амазонкі».
22.00 Прэм'ера. Маст. фільм «Красавік». 2001 г.

● НТВ

9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 Дак. драма «Злачынства і пакараньне».
10.00, 11.00, 15.00, 16.00, 17.00 Сёньня.
10.05 «Нацыянальная бясьпека: Апошні віраж Аўтаграму». Расьсьледаваньне НТВ.
14.35 Ток-шоў «Толькі для вашых вачэй».
22.25 «Усё адразу!».

● Культура

15.10 С.Пракоф'еў. Саната №1 для скрыпкі і фартэпіяна.
15.40 «Тэатральны летапіс XX стагодзьдзя». Эліна Быстрыцкая. Глава 4-я.
16.10 Парыскі часопіс.
16.40 Дзень нараджэньня А.Таркоўскага. «Насталгія па Андрэю».
17.30 Весткі.
17.40 Навіны культуры.
17.55 Паўдзённыя сны.
18.25 Да 130-годзьдзя з дня нараджэньня С.Рахманінава. Канцэрт №4 для фартэпіяна з аркестрам.
18.55 «Дапамажыце Тэлеку».
19.15 «Расейскі сьлед у Баварыі». «Другая вайна».
19.45 Да юбілею Э.Быстрыцкай. «Дачнікі». Маст. фільм.
21.25 «Лінія жыцьця».
22.20 Блеф-клюб.
23.00 «Навіны культуры» з Уладзіславам Фляркоўскім.
23.25 «Хто там...».

● Эўраспорт

7.15 Гонкі на матацыклах. Японія. Жывая трансьляцыя.
10.00 Футбол. Кубак Лібэртадорэс. Дзень 9-ы. Лібэртад — Рывэр Плэйт. Паўтор.
12.00, 14.15, 18.00 Футбол, Чэмпіянат Эўропы-2004. Адборачныя матчы. Паўтор.
16.15 Мастацкая гімнастыка. Чэмпіянат Эўропы. Жывая трансьляцыя.
20.15 Гонкі на матацыклах. Японія. Паўтор.
20.45 Супэргоначны ўік-энд.
22.00 Ралі Рэйд. Баха. Італія. Паўтор.
22.30 Трыял на матацыклах. Чэмпіянат сьвету. Мадрыд.
23.30 Супэркрос. Чэмпіянат сьвету. Х'юстан.
0.45 YOZ. Часопіс экстрэмальных відаў спорту.
1.15 Скіеркрос. Грынданьваль.

5 красавіка
субота

● БТ

7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Бэльфэгор». Мультсэрыял.
7.40 Пяць цудаў.
7.50 «Не зявай!». Тэлеканал для дзяцей.
8.20 Існасьць. Духоўная праграма.
8.55 «Усё нармальна, мама!».
9.35 Экран індыйскага кіно. «Падпальшчыкі». 1-я сэрыя.
11.05 Здароўе. Тэлечасопіс.
11.30 «Сьпявай, душа!». Фальклёрныя калектывы Менскага і Асіповіцкага раёнаў.
12.15 Вясёлая сямейка.
12.45 Падарожжа дылетанта. «Гарадок. Гісторыя замку».
12.55 Сола для дэбютанта. Людміла Сідаркевіч (актрыса).
13.10 Плянэта АРТ.
13.35 «Ёсьць толькі імгненьне...». Алена Сіньковіч
14.00 «Маршрут №...».
14.05 Сэрыял «Адысэя» (ЗША). 1-я сэрыя.
15.15 «Падарожжа зь Менску ў Маскву». Відэафільм АТН.
15.35 Кухня КВК.
15.50 Гумарыстычны фільм «Кепскі сабака» (ЗША).
16.20 КВК. 1/8 фіналу Эўралігі.
17.55 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
18.20 Камэдыя «Дзікун» (Францыя).
20.10 Найлепшыя музыкі сучаснасьці. Група «Kool and the Gang» (ЗША).
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.25 Галоўнае пытаньне.
22.05 Прэм'ера. Трылер «Страказа» (ЗША).
23.50 Начны музычны этэр.

● СТВ

5.30 Музычны канал.
6.30 «Дзікая плянэта». «Тутанхамон. У пошуках зьніклага фараона» з цыклу «У пошуках страчанага сьвету». Дак. фільм.
7.30 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
8.00 «Пітэр Пэн». Мультсэрыял.
8.25 «Хіткліф». Мультсэрыял.
8.50 «СТВ-спорт».
9.00 «Рэактыўны бокс».
9.15 «Адпачывай».
9.25 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
9.50 «Сямейнае кіно з калекцыі «Hallmark». «Арабскія прыгоды». ЗША, 2000.
10.40 Кіно: маст. фільм «Прынц і жабрак». ЗША, 2000.
11.30 Мультфільмы.
11.45 Дак. фільм.
12.00 «Разам».
12.30 «Плянэта людзей».
12.45 «Філярманічны тыдзень».
12.50 «Рамонт».
13.05 Кіно: баявік «Кур'ер на Ўсход».
14.55 «Відавочца».
15.25 «Усё для цябе».
15.55 «Чыста па жыцьці». Камэдыйны сэрыял.
16.30 «Жыцьцё зь Люі». Мультсэрыял.
16.55 «Запрашаем паскардзіцца».
17.05 «Аўтапанарама».
17.25 Кіно: камэдыя «Гульня ў чатыры рукі». Францыя—Італія, 1980.
19.30 «24 гадзіны».
19.50 «СТВ-спорт».
20.05 Кіно: мэлядрама «Масква сьлязам ня верыць», 1980.
21.25 Кіно: баявік «Уласнасьць д'ябла». ЗША, 1997.
23.20 «Навіны СНД».
23.35 Кіно: драма Кірстэна Шэрыдана «Дысказьвінны». Ірляндыя, 2001.

● Першы музычны канал

8.00 Рухач.
17.00 Музыка.RU.
18.00 УльтраМікс.
23.00 МэгаМікс.

● АНТ

8.00, 12.00 Навіны.
8.20 Грай, гармонік любы!
9.00 Слова пастыра.
9.15 Здароўе.
10.00, 14.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Смак» з Андрэем Макарэвічам.
10.30 Сьмехапанарама.
11.05 «Падарожжы натураліста».
11.35 «Самі з вусамі».
12.10 Лубянка. «Вязень №35».
12.50 Разумніцы і разумнікі.
13.15 «Ералаш».
13.35 Дыснэй-клюб: «Геркулес».
14.15 «Валянцін Елізар'еў. Люстра часу». Дак. фільм.
15.25 Выратавальнікі. Тэрміновы выклік.
15.55 «Новы дзень». «Сканэр».
16.15 Камэдыя «Кадрыля».
17.40 Мюзыкл «Нотр-Дам дэ Пары».
18.20 Шоў Клары Новікавай.
18.55 «Хто хоча стаць мільянэрам?».
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
21.00 «Апошні герой-3».
22.00 Што? Дзе? Калі? Фінал вясновых гульняў.
23.20 Трылер «Страказа» (2002 год).
1.10 «Трылёгія». Канцэрт Алсу.

● РТР

8.45 Ранішняя пошта.
9.20 «Сто да аднаго». Тэлегульня.
10.15 Сам сабе рэжысэр.
11.15 У пошуках прыгод.
12.10 Клюб сэнатараў.
13.00 Весткі.
13.20 Маст. фільм «Золата партыі». 1993 г.
15.00 Футбол. Чэмпіянат Расеі. «Тарпэда-Мэталюрг» (Масква) — «Дынама» (Масква). Жывая трансьляцыя са стадыёну імя Э.Стральцова.
17.00 Мая сям'я.
18.00 Аншлаг.
19.00 Весткі.
19.25 Люстра.
19.50 «Сумленны дэтэктыў».
20.15 Міхаіл Задорнаў. Фантазіі на зададзеную тэму.
22.50 Сусьветнае кіно. Аль Пачына, Робэрт дэ Ніра, Вэл Кілмэр і Джон Войт у вострасюжэтным фільме «Сутыкненьне» (ЗША). 1995 г.

● НТВ

9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00 Сёньня.
9.05 Кулінарны паядынак.
10.05 «Кватэрнае пытаньне».
11.05 «Жыцьцё сярод зьмей». «Прафэсія — рэпарцёр».
11.25 Служба выратаваньня.
12.05 Камэдыя «Высокі бляндын у чорным чаравіку» (Францыя).
13.45 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 «Жаночы погляд».
16.05 Вострасюжэтны фільм «Вечна малады» (ЗША).
18.00 «Сёньня» з Кірылам Пазднякоўым.
18.35 Дэтэктыў «Сышчыкі». 7-я сэрыя.
19.45 Прэм'ера. Камэдыя «Дастаць карантыша» (ЗША).
21.50 Супэрбокс. Дыега Каралес супраць Дэрыка Гейнэра.
22.20 Эратычны фільм «Урон» (Вялікабрытанія).

● Культура

11.20 ГЭГ.
11.35 «Графаман».
12.05 Дзіцячы сэанс. «Прыгоды пінгвіняняці Лола». Мультфільм.
13.35 «Дагістарычны сьвет». «Раптарызабойцы».
14.05 «До мажор».
14.35 «Мікалай Старасьцін. Бацька «Спартаку». Дак. фільм.
15.30 Да 70-годзьдзя Станіслава Любшына. Ж.Б.Мальер. «Тарцюф». Тэлевэрсія спэктаклю МХАТ.
17.50 Магія кіно.
18.20 «У вашым доме».
19.00 «Сфэры».
19.40 «Поўны нягоднік». Тэлесэрыял. 9-я сэрыя.
20.30 «Вялікія раманы дваццатага стагодзьдзя». Івон і Шарль дэ Голь.
21.00 Навіны культуры.
21.20 «Сцэны ля мора». Маст. фільм (Японія, 1991).
23.00 «Сага французкага шансону».

● Эўраспорт

7.15 Гонкі на матацыклах. Японія. Жывая трансьляцыя.
10.00 Футбол. Чэмпіянат Эўропы-2004. Адборачныя матчы. Агляд.
11.30 Супэргоначны ўік-энд. Паўтор.
12.30, 19.30 Супэргоначны ўік-энд. Гішпанія. Жывая трансьляцыя.
13.30, 15.30, 19.00 Настольны тэніс. Італія.
14.00 Настольны тэніс. Італія. Чвэрцьфіналу. Мужчыны. Жывая трансьляцыя.
16.00 Скачкі ў ваду. Кубак Эўропы. Стакгольм. Жывая трансьляцыя.
20.00 Настольны тэніс. Паўфінал. Мужчыны. Італія. Жывая трансьляцыя.
21.30 Часопіс WATTS.
22.00 Экстрэмальныя віды спорту.
23.00 Керлінг. Чэмпіянат сьвету. Вініпэг. Мужчыны. Канада—Германія. Жывая трансьляцыя.
0.30 Ралі рэйд.
1.00 Рытміка. Рыза. Чэмпіянат Эўропы.
2.00, 2.45 Гонкі на матацыклах. Японія.

6 красавіка
нядзеля

● БТ

7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Бэльфэгор». Мультсэрыял.
7.40 Пяць цудаў.
7.50 Мультыклюб.
8.30 Арсэнал. Праграма пра войска.
9.05 Алхімія слова.
9.10 «Сузор'е надзеі». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
9.40 Экран індыйскага кіно. «Падпальшчыкі». 2-я сэрыя.
11.15 Сад мары. Перадача для дачнікаў.
11.45 Музэюм. «Партрэты роду Завішаў».
12.20 «Усё нармальна, мама!».
13.00 «Вашае лято».
13.40 «Сьвятыні Беларусі». Старадаўнія крыжы зямлі Тураўскай.
14.05 «Маршрут №...».
14.10 Сэрыял «Адысэя» (ЗША). 2-я сэрыя.
15.15 «Касыяпэя». Пазнавальны сэрыял.
15.40 Сэрыял «Барацьба за выжываньне» (Вялікабрытанія).
16.35 Кліп-абойма.
17.10 Маст. фільм паводле твораў І.Буніна «Нетэрміновая вясна» («Беларусьфільм»).
19.25 Дэтэктыў «Каралеўскі скандал». (ЗША — Канада).
21.00 Панарама: падзеі тыдня.
21.50 Тэлебаромэтар. Прагноз надвор'я.
22.10 Прыгодніцкі фільм «Вядзьмак» (Польшча).

● СТВ

5.30, 11.30 Музычны канал.
6.30 «Дзікая Плянэта». «Выратавальнікі». Дак. фільм.
7.30 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
8.00 «Пітэр Пэн». Мультсэрыял.
8.25 «Хіткліф». Мультсэрыял.
8.50 «СТВ-спорт».
9.05 «Менск і менчукі».
9.15 «Партрэт у інтэр'ерах».
9.30 «Аўтапанарама».
9.50 «Сямейнае кіно з калекцыі «Hallmark». «Арабскія прыгоды». ЗША, 2000.
10.40 Кіно: маст. фільм «Прынц і жабрак».
12.05 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
12.30 «Добры дзень, доктар!».
12.45 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
13.05 Кіно: баявік «Двайны абгон». СССР, 1984.
14.55 «Відавочца».
15.25 «Сусьветныя розыгрышы».
16.00 «Вовачка-2». Камэдыйны сэрыял.
16.35 «Жыцьцё зь Люі». Мультсэрыял.
17.00 «Такая прафэсія».
17.25 «Залатая дзясятка беларускай оперы».
17.55 «Вар'яцкі сьвет». Дак. фільм.
18.45 «168 гадзін».
19.30 «Усё для цябе».
20.00 «Пакуль гарыць сьвечка».
20.35 Кіно: мэлядрама «Масква сьлязам ня верыць». СССР, 1980.
22.00 «Гульнявы рэфлекс».
22.10 «Навіны СНД».
22.25 «Славянскі сьвет Алега Лысенкі». Дак. фільм цыклу «Агульны дом».
22.40 Кіно. Баявік «Звар'яцелы аўтобус». Расея, 1990.

● Першы музычны канал

8.00, 13.45 Рухач.
12.00 «Чарнасьліў». Культуралягічнае шоў.
13.00 «Пра Fashion». Модная праграма.
17.00 Музыка.RU.
18.00 УльтраМікс.
23.00 МэгаМікс.

● АНТ

8.00, 12.00 Навіны.
8.20 Ералаш.
8.30 Армейскі магазын.
8.55 Дыснэй-клюб: «Легенда пра Тарзана».
9.15 «У сьвеце жывёл».
10.00, 14.00 Навіны (з субтытрамі).
10.15 «Падарожныя нататкі».
10.35 Пакуль усе дома.
11.15 Дог-шоў.
12.10 «Новы дзень». «Тэорыя неймавернасьці». Жывая вада.
12.40 «Клюб падарожнікаў».
13.15 «Ералаш».
13.35 Дыснэй-клюб: «Геркулес».
14.15 «Валадар смаку».
15.15 «Куміры».
15.45 Ток-шоў «Выбар».
16.25 Баявік «Хто падставіў труса Роджэра?». ЗША.
18.15 КВК-2003. Вышэйшая ліга.
20.30 Контуры.
21.10 «Апошні герой-2. Беларусы ў Рыё».
21.30 Баявік «Асада».
23.30 Часы.
0.30 Рэальная музыка.

● РТР

9.15 Ранішняя размова зь Дзьмітрыем Кісялёвым.
9.45 У «Гарадку». Справаздача за сакавік.
10.20 Парад камэдый. Маст. фільм «Ніндзя з Бэвэрлі-Хілз» (ЗША). 1997 г.
12.10 Парлямэнцкая гадзіна.
13.00 Весткі.
13.20 Сьвет на мяжы.
13.50 Пакой сьмеху.
14.55 Футбол. Чэмпіянат Расеі. ЦСКА — «Спартак» (Масква). Жывая трансьляцыя са стадыёну «Дынама».
17.05 Баявік «Кібарг» (ЗША). 1989 г.
18.50 У «Гарадку».
19.00 Весткі тыдня.
20.10 Спэцыяльны карэспандэнт.
20.35 «Аншлаг» прадстаўляе: праграма «Хто каго?».
22.30 Вячэрні сэанс. Маст. фільм «Амэрыканскі пярэваратень у Парыжы». 1997 г.
0.15 Чэмпіянат сьвету па аўтагонках у клясе «Формула-1». Гран-пры Бразыліі. Трансьляцыя з Сан-Паўлу.

● НТВ

9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00 Сёньня.
9.05 Прэм'ера. Сэрыял у нядзелі. «Каханьне ўдаўца». 2-я сэрыя (ЗША).
10.05 «Расьліннае жыцьцё».
10.35 Вы будзеце сьмяяцца!
11.05 «Ўплыў».
12.05 Дэтэктыў «Лекі ад страху».
13.50 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.15 Экстрэмальны кантакт: алігатары Паўднёвай Фларыды».
15.45 Ток-шоў «Прынцып даміно».
17.05 «Нацыянальная бясьпека: мёртвыя душы».
18.00 «Сёньня» з Кірылам Пазднякоўым.
18.35 Дэтэктыў «Сышчыкі». 8-я сэрыя.
19.45 Фільм тыдня. Баявік «Калёнія» (ЗША).
21.35 Прэм'ера. Баявік «Кафс» (ЗША).
23.35 Сэрыял «Клан Сапрана». 23-я сэрыя (ЗША).

● Культура

11.15 «Рыцары сьмеху».
11.40 Нядоўгія гісторыі.
11.55 Дзіцячы сэанс. «Дзікія лебедзі». Мультфільм.
13.25 «Дагістарычны сьвет». «Схватка тытанаў».
13.55 Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
14.50 «Час музыкі». Тэлечасопіс.
15.20 У сьвеце танцу. «Шматстайнасьць і дасканалась». Амэрыканскі тэатар балету сёньня.
16.45 70 гадоў Станіславу Любшыну. «Маналёгі».
17.25 «Пяць вечароў». Маст. фільм.
19.05 «Гамаза».
19.35 «Поўны нягоднік». Тэлесэрыял. 10-я сэрыя.
20.25 «Больш чым каханьне». «Прарочыя сны Маргарыты».
21.05 «Замкі жахаў». Дакумэнтальны сэрыял.
21.30 «Культ кіно». «Пачатковая школа». Маст. фільм.
23.25 «Джазафрэнія».

● Эўраспорт

4.00, 4.45, 11.15, 12.30, 13.45 Гонкі на матацыклах. Японія. Паўтор.
5.15 Гонкі на матацыклах. Японія. Жывая трансьляцыя.
9.30 Керлінг. Чэмпіянат сьвету. Вініпэг. Мужчыны. Канада—Германія. Паўтор.
10.30 Настольны тэніс. Чэмпіянат Эўропы. Фінал. Жанчыны. Італія.
12.15, 13.30, 15.15 Супэргоначны ўік-энд. Жывая трансьляцыя.
15.30, 17.15 Взляспорт. Кубак сьвету. Тур Фляндрыі. Жывая трансьляцыя.
16.15 Супэргоначны ўік-энд. Чэмпіянат. Гішпанія. Жывая трансьляцыя.
18.15 Веславаньне. Оксфард. Жывая трансьляцыя.
19.15 Настольны тэніс. Італія.
20.00 Супэргоначны ўік-энд. Чэмпіянат. Гішпанія. Агляд.
21.00 Аўтагонкі сэрыі НАСКАР.
22.00 Керлінг. Чэмпіянат сьвету. Вініпэг. Жанчыны. Швэцыя—Італія. Жывая трансьляцыя.
23.45 Скачкі ў ваду. Кубак Эўропы. Стакгольм.
0.45 Рытміка. Рыза. Чэмпіянат Эўропы.
1.45 Часопіс WATTS.

Наша Ніва

Працягваецца падпіска на газэту «Наша ніва».
Падпісны індэкс **63125**. Цана падпіскі на месяц — **2043** рублі.
На шапік «Белсаюздруку» — усяго **1360** рублёў. Падпіску прымаюць ва ўсіх аддзяленьнях пошты, у шапіках «Белсаюздруку».

Дык падпісвайся!

УСЕБЕЛАРУСКІ СХОД ІНТЭЛІГЕНЦЫІ

Нататкі госьця

Ішоў у ДК «Сукно» як на фэст, як на падзею нацыянальнага маштабу. Хоць і ведаў, што для людзей, якім ёсьць што сказаць, гэты будынак — нібы плошча Бангалор. Аднак, думалася, ня так важна — дзе. Урэшце, француская рэвалюцыя пачыналася з збору дэпутатаў у Залі для гульні ў мячык...

* * *

У вэстыбюлі — штурханіна, у залі — безьліч пустых месцаў. Як спалучаецца адно з другім — ня ведаю. У часе сходу спалучалася багата неспалучальнага.

* * *

Прэтэнзіі на ўсебеларускасьць — і дамінаваньне менскай тусоўкі (ад кожнай вобласьці па 20—30 чалавек), прысутнасьць у залі і ў прэзыдыюме славутых мастакоў — і надзіва беднае афармленьне сцэны ды вэстыбюлю. Сымэтрыю беларускаму лёзунгу «Незалежная Беларусь, свабоднае і заможнае грамадзтва» стварааў камуністычна-перабудовачны «Мыслить и действовать по-новому».

* * *

Каб сход меў нейкі эфэкт і розгалас, арганізатары мусілі калі не пераканаць «народныя масы» ў сваёй рацыі, дык хоць зьдзівіць іх. На сходзе бракавала «гімікаў» кшталту маладафронтаўскага збору грошай на білет у Маскву. Запомнілася хіба трубленьне ў рог — заклік да ўдзельнікаў ісьці ў залю.

* * *

Прамовы былі прадказальныя. Да 1994 г. усё ішло добра, пасьля — раптам пайшло кепска. Інтэлігенцыі трэба аб'яднацца і выправіць становішча. Рытуальныя заклікі. Дэпутат палаты прадстаўнікоў Парфяновіч паўсьміхаўся ды пайшоў па сваіх справах.

* * *

Экс-палітык А. увесь час падыходзіць да мяне ў фае і скардзіцца на згублены футарал ад акуляраў. Захацелася параіць яму зьвярнуцца ў прэзыдыюм сходу. А што, уключылі б пытаньне ў парадак дня. Дзе Ганчар? Дзе Завадзкі? Дзе футарал ад акуляраў?

* * *

У фае прадаюцца кніжкі, значкі, паштоўкі — усё як на сядзібах БНФ і ТБМ. На жаль, ня бачу кнігі філёзафа Ўладзімера Мацкевіча «Беларуская дэмакратыя: насуперак відавочнаму», напісанай у 1995 г. Ён там сказаў пару словаў пра беларускую інтэлігенцыю, ейны пэсымізм, разьяднанасьць, цягу да самападману ў лукашэнкаўскім грамадзтве. Мінула восем гадоў. Інтэлігенцыя Мацкевіча не чытае і наступае на тыя самыя граблі.

* * *

Аргкамітэт сходу зрабіў вялізную працу, сабраўшы ў адным будынку больш як 600 дэлегатаў і гасьцей ды забясьпечыўшы іх гамбургерамі ад «Макдональдзу». Праўда, дэлегаты-мусульмане тых гамбургераў ня зьелі, але гэта ўжо дэталь... Шкада, што высілкі і грошы шчырых, адданых Радзіме людзей пайшлі на штосьці сярэдняе паміж навуковай канфэрэнцыяй і зьлётам вэтэранаў ТБМ.

* * *

Плянуецца абраньне сталай Рады сходу інтэлігенцыі — 55 чалавек. Няма сумневу, у Раду трапяць разумныя ды аўтарытэтныя. Такіх нямала было на Сходзе. Варта «аўтарытэтам» прыгледзецца да досьведу Лукашэнкі. Склікаць паасобку соймікі патрыятычных настаўнікаў, дактароў, юрыстаў... Ідэя агульнага сходу інтэлігенцыі, вера ў тое, што ўлада і народ «павінны да нас прыслухацца», — адгалоскі сымпатычнага, але састарэлага мэсіянства, уласьцівага якраз савецкім людзям, якіх гэтак трапна абмаляваў Уладзімер Колас, вядучы сходу.

Максім Доўгі, Менск

НОВАЯ АПАЗЫЦЫЯ

Няхай выйдуць з палаты

У 2000-м апазыцыя агітавала за байкот выбараў у «палату». Ну як жа — гэта ж псэўдапарлямэнт, які ствараецца ўзурпатарам Лукашэнкам дзеля легітымізацыі свайго рэжыму. Што ж мы бачым сёньня? Апазыцыя братаецца з Парфяновічам і Фраловым, бачыць у іх чарговых лідэраў у барацьбе за дэмакратыю. Калі верыць прэсе, дык яны ўжо галоўныя апазыцыянэры.

А.Фядута ў «Кур'еры» абрынуўся на тых, хто крытыкаваў Фралова. Маўляў, самі прапагандавалі каштоўнасьці дэмакратыі, а як толькі нехта адгукнуўся, дык яго пачынаюць у чымсьці падазраваць. Але калі яны такія дэмакраты, дык што яны робяць у самазванай лукашэнкаўскай «палатцы»? Ну добра, можа, яны былі наіўныя тыя гады таму, але цяпер што яны там робяць? Няхай выйдуць зь яе, няхай прызнаюць факт антыканстытуцыйнага перавароту 1996 г. і самазванасьць «палаткі». Нават Чыгір сьпярша выйшаў з ураду, а пасьля стаў апазыцыянэрам.

Саюзьнікамі апазыцыі сталі тыя, каго яна называла самазванцамі. Яна згаджаецца на ролю працоўнай сілы для чарговага чыйгосьці стаўленіка. Тым самым яна сама аказваецца не народнай сілай, а інструмэнтам чужых інтрыг.

Віталь Станішэўскі, Менск

ЮБІЛЕЙ

Валянціну Грыцкевічу — 70

Сёньня на нашай вуліцы сьвята. Старшыні Беларускага грамадзка-культурнага таварыства ў Пецярбургу Валянціну Грыцкевічу — 70 гадоў.

Карэнны мянчук, Валянцін Грыцкевіч пасьля школы паступіў адразу ў тры вышэйшыя навучальныя ўстановы і пасьпяхова іх скончыў. На дзённым аддзяленьні вучыўся ў мэдінстытуце, на вячэрнім — у Інстытуце замежных моваў і на завочным — на гістфаку БДУ. У Ленінград В.Грыцкевіч прыехаў у 1975 г., калі за плячыма была практыка ўчасковага доктара на Случчыне. Працаваў лекарам, навуковым супрацоўнікам Ваенна-мэдычнага музэю, выкладаў ва Ўнівэрсытэце культуры.

Яго хобі — гісторыя падарожжаў, найноўшая гісторыя Эўропы, мэтадалёгія гістарычных дасьледаваньняў.

Спадар Валянцін не кіруе адміністрацыйнымі спосабамі — ён прызнаны і прыняты нефармальны лідэр нашага нацыянальна-культурнага руху ў Піцеры. Ён чытае малітву, калі на Дзяды памінаюцца ахвяры каля жалобнага крыжа ў Левашове, ён гаворыць радаснае Памінальнае слова ў гадавіну БНР... — ён правіць рэй у нашай суполцы.

Мы дзякуем Валянціну Грыцкевічу за служэньне айчыннай культуры, мы мяркуем стаць сьведкамі новых яго дасягненьняў.

Сябры

Чаго чакаюць ад інтэлектуалаў бюджэтнікі

Я ня меў асаблівага жаданьня пабыць на «ўсебеларускім» сходзе інтэлігенцыі. Па-першае, мне гэта не па кішэні, па-другое, як правільна паставіў пытаньне сп.Станіслаў Шушкевіч, а хто такі інтэлігент? Выдуманае некалі расейцамі слова для пазначэньня жменькі адукаваных людзей сёньня набыло неакрэсьлены сэнс. Пад панятак падвялі нейкае кваліфікаванае азначэньне і цяпер шукаюць людзей, якія таму азначэньню адпавядалі б.

На Захадзе для пласту людзей, што прадукуюць і пашыраюць ідэі, ёсьць слова «інтэлектуалы». У мяне словы «інтэлігент, інтэлігенцыя» асацыююцца з шэрагам савецкіх паняткаў «калхоз, кухвайка, кіслы гурок, выбары, нішчымніца». Сёньня я пазначыў бы гэты разбраклы пласт насельніцтва праз бруха: «бюджэтнікі». Што яднае адукаванага доктара і ягоную мэдсястру, настаўніка і прафэсара? Бюджэт.

Ідэя сходу неблагая. Але сабралася зашмат людзей. Калі б тыя людзі, што выступалі, несумненна інтэлектуалы, сабраліся меншым гуртам ды паразважалі над пытаньнем «як даць рады», то карысьці было б болей.

Інтэлектуалы зрабілі шмат. Яны ўзялі на сябе чорную працу гегемона: валакліся на мітынгі і дэманстрацыі, мелі сваю порцыю міліцыянцкіх кіюг, сядзелі замест пралетарыяў у камэрах, зьязілі на хіміях, бясьсьледна прападалі, пісалі графіці. Але ці ж гэта іхні занятак? Асьвета — поле дзейнасьці інтэлектуалаў. Іхняя чарнавая праца — у пісаньні асьветна-прапагандысцкай літаратуры.

Улада раз-пораз б'е па кліне, што падзяляе народ і яго духовую эліту. Інтэлектуальная думка ўдала прадстаўленая народу як нешта нікчэмнае, абстрактнае і нават шкоднае. Апошні бязграматны крыкун лёгка пасароміць разумнага інтэлектуала, бо на цяжкія пытаньні ніхто лепей за ўладу не дае лёгкага, прыемнага і даходлівага адказу. Наш школьнік-выпускнік — а для большасьці людзей гэта канец усякай адукацыі — не падрыхтаваны для ўспрыманьня сучаснага палітычнага жаргону, сацыялягічных паняткаў, не ведае спосабу функцыянаваньня ўлады. Складанасьці грамадзтва і сьвету ён спазнае мэтадам спробаў і памылак.

Вось поле дзейнасьці для інтэлектуалаў. Напішыце танную брашуру для школьнікаў пра палітычныя лады, пра фальшаваньне гісторыі ў школе, пра зьдзек з нашага народу пад камуністамі, пра Курапаты, пра тое, хто ж такі наш прэзыдэнт, пра эканамічныя тэорыі, пра Расею па-за тэлеэкранам і пра невядомы нам Эўразьвяз. А пра партыйную сыстэму хто напіша? Як дзейнічае наша сельская гаспадарка і нашыя банкі? Урэшце, што такое сучасная Беларусь?

На сходзе гучаў неспакой пра мову. Але як заікнешся, што няма граматыкі беларускай мовы — для навукоўцаў, для школьнікаў, для журналістаў, то пачуеш: вазьмі і напішы. Дык жа гэта абавязак унівэрсытэцкіх прафэсараў! Пра нашу выдатную мову патрэбна пісаць ды пісаць з розных гледзішчаў. Папулярызаваць яе трэба, як і кожны варты прадукт, вывучаць, забясьпечваць распраоўкамі, хваліць. Балбатні пра яе багата, а пісаніны ў падтрымку — няма. І вось першы плявальшчык на нашу мову будзе кіраваць ейным чарговым правапісам.

Сьмешна падказваць інтэлектуалам, што марна шукаць выйсьце зь цяжкага становішча не праз палітычную дзейнасьць. Існуе адзін законны інструмэнт — палітычныя партыі. Ці шмат зрабілі інтэлектуалы для тэарэтычнага абгрунтаваньня палітычнай працы ў нашых спэцыфічных умовах? Нам, простым бюджэтнікам, што неяк цягнуць воз антырэжымнай працы, не хапае веды нашага грамадзтва. Ягонай стратыфікацыі, ягоных чаканьняў, прымхаў, заган. У нас паверхоўнае веданьне гэтага. Дык хто мусіць праводзіць палявыя сацыялягічныя дасьледаваньні: я ці адмысловец з унівэрсытэту?

Трэба рэабілітаваць інтэлектуальную думку, інтэлектуальнае саслоўе і партыйную дзейнасьць як спосаб рэалізацыі інтэлекту. Трэба прывучаць народ думаць складанымі сказамі і думкамі. Прымітыўнае мысьленьне прывяло да аднаклеткавага жыцьця.

Сам я чакаю, што нашы інтэлектуалы будуць пэрыядычна ладзіць не вялікія сходы, а камэрныя сустрэчы, дзе будзе пачуты ня толькі голас зьверху, але і піск зьнізу. (Нам, людзям з пэрыфэрыі, карысна пакантачыць з нашай элітай. І ёй таксама з намі.) Што наладзяць выпуск хоць бы невялічкага часопісу кішанёвага фармату для абмену думкамі. Што падумаюць, як абараніць студэнцкую моладзь, якую рэжым прывучае да рабства. Як абараніць разумных выкладчыкаў праз патрабаваньне гарантыі ўнівэрсытэцкіх свабодаў.

Трэба ўзьняць пачуцьцё самапавагі ў растаптанага народу.

Мікола Бусел, Дуброва

МЕРКАВАНЬНЕ

Настальгія па «губэрні»?

Упраўленьне інфармацыі Менскага аблвыканкаму разаслала ў раённыя газэты абвесткі-напамінкі аб маючай адбыцца сустрэчы зь людзьмі, чый талент і здольнасьці «прославили столичный регион и родную Беларусь». Зь якой такой нагоды трубіцца збор? У красавіку спаўняецца 210 гадоў, як была ўтворана Менская губэрня. Задумка ўвогуле нядрэнная, але ці варта ўвязваць гэтую сустрэчу з датай, ад якой пачаўся адлік эпохі, калі тэрыторыя Беларусі на расейскіх мапах атрымала назву «Северо-Западный край»? Вось што наводзіць на сумны роздум, калі ўлічыць, што Крэмль нядаўна меў нахабства прапанаваць уваходжаньне ўсіх абласьцей Беларусі ў склад Расеі на правах «губэрняў» — як і 210 гадоў таму!

Міхась Кутнявецкі, Слуцак

Роздум пасьля сходу

Адбыўся Ўсебеларускі сход інтэлігенцыі. Саму ідэю сходу, яго правядзеньне можна ацаніць пазытыўна. Але трэба сказаць і пра памылкі.

Каб надаць форуму больш вагі і легітымнасьці, арганізатары прапанавалі абрацьь дэлегатаў ад гарадоў, абласьцей і раёнаў. Зрабілі ўсё дэмакратычна. Але гэты сход меў статус Устаноўчага. Бо ён зьбіраўся ўпершыню, меў на мэце абмеркаваць сытуацыю ў краіне і дапамагчы інтэлігенцыі аформіцца арганізацыйна. На Ўстаноўчы сход зьбіраюцца не дэлегаты, а аднадумцы. Зьбіраюцца па запрашэньнях і абвестках у друку. Гульня ў дэмакратыю адрэзала ад сходу шмат актыўных людзей, якія падзялялі ідэі арганізатараў. Ня трэба гуляць з таталітарным рэжымам у дэмакратыю, ён гэтага ўсё роўна не ацэніць.

Арганізатары патрабавалі вынікі сходаў аформіць пратаколам і зараней даслаць іх у Менск. Такі падыход нагадаў, што мы, былыя савецкія людзі, вырасьлі ў сфармалізаваным савецкім грамадзтве.

Не прыяла падбору ўдзельнікаў сходу і абвестка ў друку, што сходы ў рэгіёнах трэба правесьці да 10 сакавіка. Там, дзе не пасьпелі правесьці сходы да гэтай даты, зразумелі адно: мы спазніліся. І не прыехалі. Усе гэтыя хібы нагадваюць, што арганізатары не ўлічылі тых рэалій, у якіх жыве беларускае грамадзтва.

Пасьля сходу ў прэсе пачаўся лямант, што спадзяваньні ня спраўдзіліся. Незадавальненьне трэба перавараць у дзейнасьць, а не займацца самаедствам.

Большасьць удзельнікаў сходу падтрымалі ідэю аб'яднаньня ў фармаце Арганізацыйнага камітэту, які можа аб'яднаць інтэлігенцыю. Бо назва — гэта толькі форма, а зьмест — людзі, якія працуюць у аргкамітэце, і ідэі, якія яны вылучаюць і ажыцьцяўляюць. Нездарма Дэн Сяапін, архітэктар кітайскіх рэформаў, казаў: «Ня важна, якога колеру котка, галоўнае, каб яна мышэй лавіла».

Яўген Лугін, Менск

Камэрцыйны посьпех

20 сакавіка ў дзьвюх галоўных менскіх залях паралельна адбываліся знакавыя канцэрты. У Палацы Рэспублікі — вечар памяці Ўладзімера Мулявіна, у КЗ «Менск» — канцэрт праекту «Я нарадзіўся тут». Абедзьве імпрэзы ў нейкай ступені рэтраспэктыўныя, абедзьве сабралі аншлягі, але на гэтым падабенства сканчаецца. Мулявінскім канцэртам ставілася кропка: іншай асобы, якая здолела б мабілізаваць колішнюю СССРаўскую музычную эліту на канцэрт у Беларусі, няма. «Я нарадзіўся тут» засьведчыў пэрспэктыўнасьць і камэрцыйны посьпех «незалежнае музыкі».

АНАТОЛЬ КЛЯЦЧУК

Вераніка Круглова і Лявон Вольскі на сцэне канцэртнай залі «Менск»

Квіткоў на вечар памяці У.Мулявіна ў вольным продажы было небагата. Абураныя аматары «Песьняроў» нават усчалі лямант на інтэрнэт-форумах. Заставалася суцяшацца тым, што канцэрт двойчы будуць трансьляваць па тэлевізіі. Заля поўнілася «льготнікамі» — у асноўным суворяўцамі ды салдатамі. Адпаведная была й дысцыпліна. За пяць хвілінаў да пачатку ўваходныя дзьверы зачынілі, і тыя, хто крыху спазьніўся, мусілі літаральна «прарывацца» на свае месцы.

У «Казе» было больш дэмакратычна. Люд здолеў нават патанчыць. На лірычныя песьні даставалі запальнічкі ды махалі ў такт — зазвычай ахова «Казы» гэткага не дазваляе. Быў толькі адзін камічны інцыдэнт. Адна дзяўчына заснула пад музыку. Падышоў ахоўнік — пацікавіцца, ці ня выкліканы ейны стан ужываньнем якіх непажаданых прэпаратаў. Выявілася, што слухачцы папросту зрабілася добра і ўтульна ад агульнае атмасфэры канцэрту.

Кіраваў працэсам Вольскі — аб'яўляў песьні, рабіў камэнтары. Дый рытм-сэкцыя «NRM» працавала ўвесь канцэрт. Толькі на «Крывавым сьвяце» выйшаў у поўным складзе «Уліс», які тыднем раней даў адрэналінавы канцэрт у ДК Камвольнага камбінату. На «Пагоні» некалькі чалавек прыўсталі зь месцаў. Міліцыянты спачатку спрабавалі супакоіць іх, але потым узьнялася ўся заля. Тое самае паўтарылася і пад «Палянэз», і пад «Магутны Божа». Пра загалоўную песьню лішне казаць.

У некалькіх кампазыцыях альбому адчувальна зьмяніліся аранжыроўкі. «Радзінная» загучала больш акустычна, «У бары, бары» набыла цыганскае адценьне, «Не загаснуць зоркі ў небе» сталася цяжкарокавай. Пры канцы на сцэне зьявіўся Алесь Суша — натхняльнік праекту. Ён у чарговы раз паабяцаў, што хутка выйдзе «Скрыпка дрыгвы» — чарговы супольны дыск песьняў на вершы Караткевіча. Адну зь іх («Беларускую песьню») Тодар з «WZorkiestra» прасьпяваў пад заслону. А пасьля павіншаваў усіх з гадавінай БНР. Заля гукнула «Жыве Беларусь!». Прыемна, што жыве яна ў тым ліку і ў прэстыжных канцэртных залях. Нават тое, што і на канцэрт групы «Лесоповал» у тым самым КЗ квіткі прадаюцца бяз рэшты, меней палохае. Ужо йдзём на роўных.

Сяргей Будкін, СМ

ДЫСКАГРАФІЯ

Не люби нелюбимого

Ансамбль «Беларускія песьняры». 2CD. (р) «Беларускія песьняры», 2003

Альбом можна разглядаць як працяг «песьняроўскіх» традыцый апошніх гадоў, калі ў рэпэртуары калектыву спалучаліся расейскамоўныя шлягеры й апрацоўкі народных мэлёдый. Першыя, нават калі згадаць «Вологду» ці «Беловежскую пущу», у лік значных мастацкіх дасягненьняў залічыць складана. Бо менавіта народныя песьні раскрывалі патэнцыял гурту і задавальнялі творчыя амбіцыі.

На першым дыску 13 студыйных песень, зь якіх 10 напісаў Алег Аверын (так цяпер трэба называць Алега Казловіча). Сярод чортавага тузіну толькі «Зачарованая» ды «Чарнавая, бялявая» гучаць па-беларуску. Песьні Аверына — моцна скроеныя, добра запісаныя нумары, у якіх, аднак, больш нечага накшталт брыт-попу, чым ранейшых, звыклых «Песьняроў». Каб не знаёмыя галасы, здагадацца, што гэта менавіта наш ансамбль, было б няпроста. Усе песьні радыёфарматныя, гучаць ня больш за 4 хвіліны і скіраваныя найперш на расейскую аўдыторыю.

Зьвяртае на сябе ўвагу рэмікс «Вологды» (запявае Ігар Пеня), зроблены ў такім сабе бадзёра-моладзевым настроі. Атрымаўся жарцік, можа, нават з парадыйным элемэнтам, тым больш што сама песьня прадугледжвае менавіта такое прачытаньне.

Другі дыск — канцэртны. Тут ужо амаль усе песьні гучаць па-беларуску і даюць выдатную магчымасьць адчуць, у якой атмасфэры адбываюцца цяпер канцэрты «Беларускіх песьняроў». Чуваць, што, апрача вакальных партый, вялікая ўвага надаецца інструмэнтальным эпізодам, у якіх каралюе піяніст Максім Пугачоў. Да прыходу ў ансамбль ён выступаў у складзе джаз-гурту «Apple Tea». Музыка дасканалая і надзвычай жывая, насычаная імправізацыямі, што найбольш яскрава паказваюць амаль 14-хвілінная вэрсія «Касіў Ясь канюшыну» і «Купалінка» ў аранжыроўцы ўсё таго ж Пугачова. Яшчэ ёсьць заліхвацкая песьня «Рэкурут», цудоўная «А ў полі бяроза...» на музыку Ігара Паліводы з аранжыроўкай Валер'я Дайнэкі, сьвежы варыянт «Алесі» Ігара Лучанка. Гэты вось дыск яўна адрасаваны беларускай аўдыторыі, хоць і сканчаецца зноў жа «Вологдой» — такой сабе «Ob-la-di, Ob-la-da» тутэйшага разьліву.

Беларускі Слухач

Hush

Карыяна. Дэма, (р) 2002

Гатовы даць уласны кампакт-прайгравальнік на адсячэньне: лепшае прэтэндэнткі на ўдзел у «Эўрабачаньні» ад Беларусі сёньня няма. Маладзенькая Карыяна выдала тузін ангельскамоўных песень на ўласныя тэксты, якія адпавядаюць усім патрабаваньням гэтага выключна камэрцыйнага фэстывалю.

У сувязі зь невысокім мастацкім патэнцыялам «Эўрабачаньня» можна было б аўтаматычна перанесьці гэтую загану й на тое, што прапануе Карыяна. Аднак... неяк не выходзіць. Аранжыроўкі песень, хоць і добра адпавядаюць адпрацаваным эўрастандартам, нясуць у сабе нейкі няўлоўны тутэйшы дух. У іх ёсьць жывінка, яны сапраўды прыдуманыя, вынайдзеныя кампазытарам усіх песень Леанідам Шырыным (у мінулым — удзельнікам «Новага Неба»), а таксама Дзімікам Слабковым і самой Карыянай (Кацярынай Качынай).

Аднак слухаць дэма-альбом цалкам цяжкавата. Усе трэкі паасобку — грунтоўна выпісаныя ўдалыя шлягерныя нумары. А сабраныя «да кучы», яны хутка стамляюць: аднастайнасьць аранжыровак, падобныя рытмічныя формулы, адзіны настрой не даюць перавесьці дыханьне. Хоць практычна кожная з гэтых песень у любой зборцы шлягераў будзе ўспрымацца на «ўра». Дый хто дазволіць Карыяне сьпяваць на «Эўрабачаньні» ўвесь альбом?

Мы яшчэ пачуем пра гэтую стылёвую, пазнавальную, пэрспэктыўную сьпявачку. Поўны «хаш» ёй не пагражае.

Loud Slukhatch

Year of the Blues 2003

Розныя выканаўцы. (р) «Лібэрці мотарз», 2003

Надзвычай рэдкі дыск, выданьне якога ініцыяваў новы аўтасалён «Лібэрці мотарз». Дыск распаўсюджваецца выключна сярод кліентаў салёну. Запісала яго група менскіх блюзавых музыкаў: дуэт «Svet&Al», да якога далучыліся вакаліст і гітарыст Біг Уол, саксафаніст Павал Аракелян, кантрабасіст Арцём Гаўрушын.

Альбом складаецца з клясычных блюзаў Уілі Дыксана, Робэрта Джонсана, Чэстэра Барнэта. Гучыць усё на належным узроўні, зьнізіць які ня здолелі нават умовы запісу ў адной з хатніх студыяў Менску. Нягледзячы на тое, што Біг Уол куды старэйшы за іншых музыкаў, усе яны выдатна разумеюцца, граюць паветрана. Удзельнікі дуэту «Svet&Al», хоць і захапіліся блюзам усяго год таму, дэманструюць грунтоўнае адчуваньне стылю, чым і прывабілі аўтасалён. Бо лепшай за блюз музыкі для дылера машын маркі «Форд» прыдумаць цяжка.

Салён «Лібэрці мотарз» стварыў надзвычай пэрспэктыўны прэцэдэнт. Бо калі кожная дзясятая фірма дапаможа айчынным музыкам выдаць адзін альбом — чакаць росквіту папулярнай музыкі доўга не давядзецца. Так і хочацца прапанаваць фабрыцы «Камунарка» праспансаваць дыск групы «Краски», Міністэрству замежных справаў — чарговы альбом «NRM», Кіраўніцтву справаў прэзыдэнта — «Беларускіх песьняроў»...

А вам застаецца набыць які «Мандэа» ці лялечную «Фіесту», каб зрабіцца ўладальнікам гэтага сапраўды добрага альбому, які ў шырокім продажы ня зьявіцца.

Лібэрці Слухач

«НН»: Чаму Вы назвалі сваю каманду «WZ-orkiestra»? Нейкая пальшчызна?

Зьміцер Вайцюшкевіч: Зьявілася патрэба назваць праект, які складаўся. WZ — Вайцюшкевіч Зьміцер. А ўжо пасьля сябры з Польшчы мне сказалі, што ёсьць траса WZ (Wschód—Zachód) у Варшаве. Мне імпануе пракладаць магістраль Усход—Захад. Гэта банальна, але заўжды актуальна.

«НН»: А можа, у назьве ёсьць намёк, што WZ — чалавек-аркестар?

З.В.: Не. Мне больш падабаецца тэрмін «артыст». Мяне замала для аркестру, але якраз дастаткова для артыста.

«НН»: Вы зь дзяцінства ведалі, што будзеце музыкам?

З.В.: Не скажу, што паходжу з супэрмузычнай сям'і. Але песьня ў нашым доме была заўжды, нават пасьля раньняй сьмерці бацькі. Цяпер радзіна мне кажа, што я раблю тое, чаго не пасьпеў бацька.

Маё захапленьне музыкай выбухнула, калі я патрапіў у лягер «Зубраня». Я ўвесь час сьпяваў там, бо закахаўся ў дзяўчынку Юлію. Хацелася зьвярнуць на сябе ейную ўвагу.

АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Зьміцер Вайцюшкевіч нарадзіўся ў 1971 г. у Бярозаўцы — мястэчку, дзе працуе легендарная гута. У 15 гадоў паступіў у Лідзкую музвучэльню па клясе клярнэту. Пяць гадоў у Інстытуце культуры — таксама клярнэт. Скончыў Менскую музвучэльню па клясе вакалу. Ад 1992 да 1998 г. працаваў у гурце «Палац», у 1997—2001 г. — у «Крыві». Браў удзел у праектах «Народны альбом», «Сьвяты вечар», «Я нарадзіўся тут», «Скрыпка дрыгвы». У 2001 г. выпусьціў сольны дыск «Цацачная крама» ды стварыў гурт «WZ-orkiestra». Летась у кастрычніку выйшаў ягоны другі альбом — «Баляды». Зьміцер Вайцюшкевіч лічыць, што ў яго ёсьць шлях і ён акурат ступіў на яго. Гэта Тодар уважае за вялікае шчасьце. Мы сядзім позьнім вечарам на кухні «НН» ды размаўляем пра Зьмітроў шлях.

«Маці плача, калі бачыць мае выступы»

Сьвятлана Курс гутарыць са Зьмітром Вайцюшкевічам

«НН»: У «Зубраня» траплялі толькі пай-дзеткі. Вы былі такім?

З.В.: Не, папросту захварэў старшыня савету піянэрскага атраду. Яго звалі Дзіма. Я «тожа Дзіма», быў ужо бяз бацькі, а там набіралася зьмена, у якой было шмат сіротаў. Настаўнік спыніў мяне на лесьвіцы: «Хочаш ехаць?» — «Хачу». Для мяне гэта быў шанец кудысьці паехаць. Да 6-й клясы я Горадні, Менску, іншых гарадоў увогуле ня бачыў. Бедная сям'я, было не да паездак.

Пасьля лягеру вярнуўся ў школу іншым чалавекам, разбуджаным быццам. Я пакаштаваў прызнаньне раўналеткаў і выкладчыкаў, паглядзеў на нармальныя гульні, жыцьцё дзяцей, якія маюць шырокія магчымасьці. Бо я ж рос як партызанскае дзіця: лес, грыбы, ягады, сок бярозавы ўвесну, драўляныя аўтаматы, карбід, авіяцыйны паліго́н з бомбамі.

«НН»: У такой абстаноўцы вы скончылі музычную школу…

З.В.: Не, ня ўсё так проста. Я запісаўся быў на фартэпіяна, але дзе ж узяць грошай на інструмэнт? Дый за саму школу трэба было плаціць 16 рублёў штоквартал, а мы з мамай не маглі сабе гэтага дазволіць. І я пайшоў у дзіцячы духавы аркестар. Гэта было супэр! Шмат інструмэнтаў, грай на чым хочаш. Пасьля, у 5-й клясе, мяне зноў завялі ў музычную школу, і я застаўся. Падабалася прыгожая выкладчыца. Але праз паўгоду ўсё адно кінуў. Трэба было флейту купляць… Ізноў падаўся ў духавы аркестар.

Я нават хацеў застацца на другі год у школе, каб лепей авалодаць музыкай. Але дырэктар адгаварыў. Я граў у школьным ВІА на бубнах, сьпяваў песьні пра каханьне, і, натуральна, была дзяўчына…

«НН»: Яшчэ мы дзяцінства не прайшлі, а я ўжо трох жанчын у Вашай біяграфіі налічыла. Што, ня можа артыст без «кахайце мне рана, кахайце вячорам»?

З.В.: Я дастаткова аўтаномны чалавек у творчасьці. Аднак менавіта першае каханьне мела для мяне найбольшае значэньне. Я закахаўся ў яе ў садку, потым кахаў яе і ў школе. Тут быў элемэнт непрызнанага каханьня, бо яна была з багатай сям'і, з начальства. Прыгожая, выдатніца. Калі б ня гэтае незрэалізаванае каханьне, я шмат чаго не зрабіў бы. Сядзеў бы там на шклозаводзе. Хаця пры ўсім гэтым люблю Бярозаўку і гуту.

«НН»: Езьдзілі туды з канцэртамі?

З.В.: Толькі з «Палацам». Але калі ідуць выступы на тэлевізіі й радыё, уся Бярозаўка тэлефануе маці дахаты: «Уключай тэлевізар, Дзімку круцяць!»

«НН»: Маці падабаецца Вашая кар'ера?

З.В.: Яна ўвесь час плача, калі бачыць мае выступы. А каб ганарыцца? Яна занадта для таго просты, сьціплы, самастойны чалавек. Я таксама магу плакаць па нейкіх родных, інтымных рэчах, калі бачу іх на экране тэлевізіі. Затое радня ганарыцца.

«НН»: Ці патрэбная Вам для творчасьці чыясьці ўхвала ці крытыка?

З.В.: Мне вельмі патрэбная ўвага блізкага чалавека. Я магу да бясконцасьці абмяркоўваць нейкія нюансы. Мая жонка мастачка, і яе артыстычны густ шмат для мяне значыць. Адначасна я жадаю да ўсяго дайсьці сам. Толькі нядаўна мне адкрыўся слых на паэзію. Да гэтага я ня чуў, не цаніў яе. Цяпер гатовы сьпяваць Уладзімера Караткевіча ці Алеся Камоцкага. Працую зь вершамі Маякоўскага.

«НН»: Па-расейску?

З.В.: Так. Мулявін жа таксама не перакладаў... Толькі ня думайце, што я хачу яго пераплюнуць. Папросту Маякоўскі для мяне — цікавая фігура. Супрацоўніцтва з уладай, стасункі з жанчынамі, сіла асобы, роўная сіле рэвалюцыі, і сьлёзы абсалютна бездапаможнага чалавека. Творцы адзінокія, нават маючы сем'і, каханьне, радзіму. Трагічная была самота Купалы... Мулявін таксама быў адзін.

«НН»: Такім чынам, каханьне — гэта ілюзія, неабходная, каб ствараць дзяцей і іншыя творы?

З.В.: Можна пагадзіцца. Але без ілюзіі нельга жыць. Проста нецікава і няварта. Робішся як агрэгат.

«НН»: У Вас ёсьць уласная філязофія?

З.В.: Не баяцца ніякіх штампаў. Банальнасьць — цудоўная рэч. Зацёртымі бываюць толькі глыбокія ісьціны. Бачыш рэч — можна ўявіць яе ў розных абставінах, пакруціць і так, і гэтак. Параўнаем мастацтва з кулінарыяй.

«НН»: Французы і лічаць кулінарыю відам мастацтва.

З.В.: Менавіта. Яны інтэрпрэтуюць самую банальную страву так, што яна стаецца шэдэўрам. Справа ў дэталях, прыправах, мастацкім стаўленьні да жыцьця.

«НН»: У Вас ёсьць хобі?

З.В.: Зьбіраю характары. Калекцыяную пэрсанажаў на вуліцы, у краме. Нават калі бачу твар у цягніку мэтро, які праносіцца міма, дамалёўваю жыцьцё гэтага чалавека — да таго моманту, як ён сеў у гэты цягнік, і пасьля таго, як зь яго выйдзе.

«НН»: Вам імпануюць вынікі Вашай працы?

З.В.: Так. Я 10 гадоў у гэтым бізнэсе. І што файна: у Беларусі што ні зробіш, калі ты зробіш гэта творча, усё будзе гучаць як упершыню. Прыемна быць першаадкрывальнікам, але замінае адсутнасьць традыцыяў. Прытым Беларусь артыстычная краіна з пункту гледжаньня музыкі.

«НН»: Асабліва фольк-музыкі.

З.В.: За апошні год я браў удзел у двух міжнародных конкурсах этнамузыкі, і ў абодвух быў ляўрэатам. Прафэсійна заходнія музыкі вышэйшыя на некалькі галоў, але матэрыял, які даём мы, — мацнейшы. У нас ёсьць людзі, якія і самі могуць стварыць традыцыю. Лявон Вольскі можа быць айцом-заснавальнікам у якой хочаце сфэры. Міхаіл Фінберг таксама.

«НН»: З чым зьвязаны такі пад'ём у беларускай музыцы? Ледзь пасьпяваеш набываць новыя кампакты. Гук лепшае проста на вушах…

З.В.: Не на высьпе жывём. Вакол нас суседзі пачынаюць цаніць прафэсіяналізм. І мы вучымся паважаць сябе. Нават калі няма грошай, трэба проста прыйсьці ў студыю і працаваць. Людзі пачынаюць выбірацца з дэпрэсіі і ня мараць больш пра чароўнае вяртаньне да Адраджэньня пачатку 90-х. Нават калі год выдаецца кепскім, працуючы, ты яго паляпшаеш і для сябе, і для краіны. Тады жыцьцё паддаецца.

«НН»: І што Вы напрацуеце ў найбліжэйшы час?

З.В.: Мне цікавыя Маякоўскі, Камоцкі, Дранько-Майсюк, Жылка. Да лета завяршу працу з Маякоўскім і Камоцкім. Будуць два альбомы.

«НН»: Апрача «Цацачнае крамы», што Вы зрабілі для сына? Які Вы бацька?

З.В.: Я стараюся. Раней думаў: дзіцяці патрэбен бацька. А цяпер думаю: бацьку вельмі патрэбны сын. Калі ёсьць гэтая ўзаемная патрэба, складанасьці ў сям'і нівэлююцца. Час ад часу я нядобры бацька. Цягам двух гадоў, як нарадзіўся Андрэй, вучуся быць добрым бацькам.

«НН»: Вашая жонка — мастачка Алена Мелех. У мастачак таксама ёсьць амбіцыі. Хто павінен паступіцца дзеля выхаваньня дзіцяці?

З.В.: Яна малюе. Яна яшчэ ў стадыі навучаньня.

«НН»: Дзе Вы пазнаёміліся з Аленай?

З.В.: На «сьвяце горада» (сьмяецца). Гэта было ў часы Касі Камоцкай зь Лявонам Вольскім. Я быў старэйшы, а Алена — зусім зялёная, гулялася з малодшай Касяй Камоцкай. Потым яна падрасла, і маё стаўленьне зьмянілася…

«НН»: На «Форуме беларускіх баб» выказвалася неразуменьне, чаму Вы і Лявон разышліся з сваімі першымі, зорнымі жонкамі…

З.В.: О, гэтага камэнтаваць я ня буду. Ня буду ніяк згадваць цяпер Вераніку. Асабістае жыцьцё — табу.

«НН»: «Чытайце ў таблёідах!», якіх няма. Музыкі мелі б хуткі посьпех пры наяўнасьці жоўтай прэсы?

З.В.: Мяне ня так ужо хвалюе хуткі посьпех. Хоць посьпех ёсьць, я яго адчуваю на канцэртах. Адчуваю пазытыўныя зьмены ў творчым клімаце. У нас ёсьць адказнасьць за брэнд — «NRM» гэта, «WZ-orkiestra» ці Зьміцер Вайцюшкевіч. Беларускае мастацтва ідзе доўгім, сумленным шляхам. Трэба працаваць доўга, і тады штосьці атрымаецца — працяглае ў часе. Ну, ёсьць яшчэ такія паняткі, як талент і Боская рука.

«НН»: А на Вас пакладзена Боская рука?

З.В.: Мне шанцуе, я гэта заўважаю. У мяне ёсьць шлях, а такім Бог дапамагае. (Абодва ўдзельнікі інтэрвію плююць тры разы і стукаюць аб стол.)

Тыповыя памылкі 2002 году

З тэлевізара і радыё ў мову пакрыху праточваецца трасянка. У нейкі момант заўважаеш, што кажаш «па запрашэньню» замест «на запрашэньне», «па зьвесткам» замест «паводле зьвестак». А там і да «трапкі» з «карандашом» недалёка. Як і на пачатку кожнага году, у «НН» сабраныя тыповыя памылкі, заўважаныя ў артыкулах нашых аўтараў і лістах чытачоў за год мінулы.

Ня мае сэнсу

Вельмі часта мы ўжываем вінавальны склон замест роднага і кажам ‘не лічылі галасы’, ‘не падаў руку’ замест *не лічылі галасоў, не падаў рукі*. У гэтым выпадку мы ігнаруем правіла, паводле якога **дзеяслоў з адмаўленьнем вымагае роднага склону залежнага ад яго назоўніка**: *ня ўзяў вышыні, ня мае сэнсу*.

Былі чуваць словы

Другая частая памылка — неапраўданае ўжываньне безасабовых сказаў: ‘Праз туман было відаць дарогу’, ‘Скрозь шум было чуваць словы’. Такая лексычная канструкцыя перанятая з расейскай мовы. Беларус можа сказаць: ‘Нам было весела’, ‘Ёй стала сорамна’. Але, між тым, ён гаворыць: *‘Праз туман была відаць дарога’, ‘Праз шум былі чуваць словы’*. Трэба запомніць: назоўнікі (прыметнікі, займеньнікі) пры лексэмах *відаць, чуваць* ставяцца ў форме назоўнага склону (*дарога, словы*).

Незагойная рана

Калькуючы расейскую мову, беларусы прызвычайваюцца да ўжываньня дзеепрыметнікаў з суфіксам *-уч (-юч)*: ‘дамінуючая плынь’, ‘кіруючыя кадры’, ‘Тамаш няверуючы’, ‘абслугоўваючы пэрсанал’, ‘незажываючая рана’. Хоць суфікс *-уч (-юч)* можа сустракацца ў беларускіх назоўніках (‘будучыня’) і дзеепрыслоўях (‘махаючы рукамі’), наконт дзеепрыметнікаў існуе пэўнае правіла: **калі дзеепрыметнік не нясе прыкметаў зьмяненьня ў часе, ён замяняецца прыметнікам** — правільна будзе *дамінантная плынь / плынь, што дамінуе, кіроўныя / кіраўнічыя кадры, Тамаш няверны, абслуговы пэрсанал, незагойная рана.*

Увогуле, падчас утварэньня прыметнікаў мы часта робім памылкі: пішам ‘фірменны’ замест *фірмавы* або *фірмовы*, ‘дарэформенны’ замест *дарэформавы*, ‘бясформенны’ замест *бясформавы*, ‘язьвенны’ замест *язвавы* і г.д. А прыметнікі, утвораныя ад назоўнікаў з асноваю на *-цыя* (дысыміляцыя, фікцыя), пад уплывам расейскай мовы пішам зь фіналью *-тыўны*, тым часам як аснова дазваляе пісаць і з *-цыйны: дысыміляцыйны, камунікацыйны, фікцыйны* і да т.п.

Дырэктарка, камандзірка

І не забываймася, што ў беларускай мове **шырока ўжываюцца назоўнікі жаночага роду, якія абазначаюць жанок паводле прафэсіі, пасады**: *дэпутатка, камандзірка, аўтарка, касірка.* Ня трэба баяцца такіх словаў — яны цалкам адпавядаюць законам нашай мовы.

Запазычаныя ‘санаторый’, ‘сцэнарый’, ‘камэнтарый’, ‘Юрый’, ‘Георгій’, ‘аграрый’ таксама часьцяком пішуцца на расейскі ўзор — з канчаткамі *-ій, -ый*. Унікаючы названых фіналяў, аддаём перавагу старым беларускім формам *санаторыя, сцэнар, камэнтар, Юры / Юр, Георг, аграрнік.* Як бачым, звычайна *-ый* проста адсякаецца. У некаторых выпадках такія словы пераходзяць у жаночы род, набываючы канчатак *-ыя*, як гэта адбылося з ‘санаторыяй’.

Мамчын сынок

Калі мы маем справу з прыналежным прыметнікам, утвораным ад назоўніка жаночага роду, тады ўжываем суфіксы *-ін, -ын: лісіны хвост, мамчын сынок,* але ніяк ня ‘лісі(й) хвост’.

І, калі мы ўжо зачапілі фіналі, хочацца згадаць дапушчальныя ў тарашкевіцы, але скасаваныя дэкрэтам 1933 г. множналікавыя канчаткі назоўнікаў мужчынскага і ніякага родаў: у месным склоне *-ох* і *-ёх* — *у вачох, у лясох, у палёх;* у давальным склоне *-ом, -ём* — *чытачом, сябром*.

На свой густ

Часта трапляецца ў нашай сённяшняй гаворцы і **няправільнае кіраваньне**. Прыкладам, значэньні і ўжывальнасьць прыназоўніка ‘*па*’ ў беларускай мове адрозьніваюцца ад значэньняў і ўжывальнасьці прыназоўніка «по» ў расейскай. «Па» часта значыць ‘*пасьля*’: *па вайне* — гэта ‘*пасьля вайны*’, а *па пятніцах* — ‘*пасьля пятніц*’. Каротка пазначым, як даваць рады кіраваньню: *пайсьці па грошы* (не ‘за грашыма’), *згодна з дамоваю* (не ‘дамовы’), *наведаць па запрашэньні / на запрашэньне* (не ‘па запрашэньню’), *паведаміць пад сакрэтам* (не ‘па сакрэце’), *выбіраць на свой густ* (не ‘па свайму густу’), *відаць з усяго / па ўсім* (не ‘па ўсяму’), *стварыць на ўзор / паводле ўзору* (не ‘па ўзору’), *паляваць на зайца* (не ‘за зайцам’), *знаходзіцца за дваццаць кілямэтраў ад гораду* (не ‘ў дваццаці кілямэтрах’), *даглядаць хворага* (не ‘за хворым’).

Раз ужо трапілася слова «даглядаць», зьвярну ўвагу, што хворага, бабулю даглядаюць, а вось на мытні нас *надглядаюць*, мы праходзім *мытны надгляд*.

Трапляецца й **няслушнае ўжываньне прыназоўнікаў**. Так, для азначэньня прычыны многія ўжываюць выключна прыназоўнік *з-за*, забываючыся, што ў беларускай мове прычына паказваецца таксама пры дапамозе прыназоўнікаў *праз, дзеля, ад* ці проста *з: дзеля марозу, празь пярэчаньні, ад хваробы, зь перашкоды.*

Ясьце, дасьцё, п’яце

Бывае, мы пачынаем, як расейцы, казаць: ‘ідзёце’, ‘вядзёце’, ‘п’ёце’, ‘стрыжоце’. Але ж у такіх дзеяслоўных формах націск падае на апошні галосны канчатку: *ідзяце́ / ідзяцё, маўчыце́ / маўчыцё, ясьце́ / ясьцё, дасьце́ / дасьцё, ведзяце́ / ведзяцё, п’яце́ / п’яцё, стрыжаце́ / стрыжацё*. Каб дакладна вызначыць месца націску, можна паставіць слова ў першай асобе множнага ліку: ‘мы ідзём’, ‘мы маўчым’ — націск падае на апошні склад. Значыць, і ў другой асобе ён будзе тамсама.

Аплачваць

Здараецца й адваротнае, калі мы штучна множым памылкі, намагаючыся гаварыць «**ня так, як расейцы**». Самы пашыраны прыклад — слова *аплачваць*. Аднакаранёвыя да яго — *аплата, сплата, плацеж, плаціць, платны, платнік*. А нас цягне аплочваць праз аналёгію з тымі словамі, у якіх пад націскам выяўляецца этымалягічны [о] (*выкопваць, саскокваць*). У слове *аплачваць* — этымалягічны [а], дык не зьмяняйма яго.

На самай справе

Яшчэ любім мы ўжываць словазлучэньне ‘на самой справе’. А правільней было б ‘*на са́май справе*’. А калі яшчэ лепей паразважаць, дык гэтая канструкцыя цалкам скапіяваная з расейскай, а па-нашаму лепей сказаць *насамрэч, напраўду, дапраўды, папраўдзе, у рэальнасьці.*

Цяпер і зараз

Слова *зараз* мы таксама часта ўжываем на ўзор расейскага *сейчас*. Апошняе ў нашых суседзяў мае тры сэнсы: 1) хутка, зараз; 2) цяпер; 3) адразу, зразу. У беларускай мове на кожнае значэньне ёсьць асобнае слова. Аднак мы ўжо нават не заўважаем сваёй памылкі, калі кажам ‘зараз’ замест *цяпер*. Трэба памятаць: *зараз* будзе тое, што яшчэ не адбылося, але вось-вось адбудзецца (*зараз прыйду*). Калі ж гаворка йдзе пра тое, што ёсьць, — мусім сказаць *цяпер*.

Ні ў якай, ні ў кога

І пры канцы нашага ўроку роднай мовы паўторым лёгкае правіла: калі мы разьбіваем прыназоўнікам адмоўныя займеньнікі *ніякая, нікога* і да іх падобныя, напісаньне гэтых займеньнікаў захоўваецца — *ні ў якай, ні ў кога*.

Галіна Рабянкова

КАЛЯНДАР

Вяртаньне Міхальчука

Янка Філістовіч ды Цімох Вострыкаў былі не адзінымі прадстаўнікамі беларускай палітычнай эміграцыі, засланымі ў пачатку 1950-х у акупаваную бальшавікамі Беларусь. На Бацькаўшчыну вярталіся й іншыя патрыёты. 28 сакавіка спаўняецца 50 гадоў з часу сьмерці беларускага партызанскага камандзіра Сымона Міхальчука.

У пачатку 1950-х баявая частка эміграцыі вырашыла, што надышоў час браць ініцыятыву ў свае рукі і рэальна дапамагаць значна парадзеламу Супраціву на Бацькаўшчыне. У 1950 г. паўстала кансьпіратыўная палітычна-вайсковая арганізацыя «Беларускі вызвольны рух» (БВР), якую ачольваў маёр (пазьней — палкоўнік) Людвік Галубовіч (Зарэчны). Яе галоўнай задачай было зьбіраньне пад адзіным кіраўніцтвам беларускіх вайскоўцаў ды іх адпаведны вышкал на выпадак узброенага канфлікту Захаду з СССР.

Пры дапамозе ангельцаў БВР накіраваў у Беларусь і Польшчу некалькі дыверсійна-выведных групаў, якія выканалі заданьне й вярнуліся ў Вялікабрытанію (пра аднаго з дэсантнікаў, Аляксандра Петраша, ангельскі журналіст напіша кнігу «Няма месца, дзе скласьці галаву»). У гэтай дзейнасьці БВР цесна супрацоўнічала з Украінскай нацыянальнай гвардыяй атамана Тараса Бульбы-Бараўца, якая таксама засылала сваіх людзей на Палесьсе і Валынь. Дзесьці ў 1951 г. у Беларусі дэсантаваўся афіцэр, сябра БВР і Згуртаваньня беларускіх патрыётаў Сымон Міхальчук (на выключана, што зь ім было яшчэ некалькі чалавек).

У параўнаньні зь Янкам Філістовічам, які ў гэты ж час дзейнічаў на Маладэчаншчыне, С.Міхальчук меў больш жыцьцёвы і вайсковы досьвед. Мо таму і пратрымаўся на нелегальным становішчы даўжэй. С.Міхальчук арганізаваў з разрозненых груповак «лясных братоў» партызанскі аддзел, які вясной 1953-га распачаў дзейнасьць на Кобрынішчыне. Пакуль вядома толькі пра адну ягоную акцыю. Праўдападобна, яна была прымеркавана да 25 сакавіка. Газэта «Беларускі голас» (Таронта) у лютым 1954 г. зьмясьціла зацемку «Збройная барацьба ў Беларусі», дзе згадала пра напад беларускіх партызанаў на савецкі транспарт каля Кобрына. У адказ на гэтую акцыю бальшавікі ладзілі аблавы ды рэпрэсіі. І аддзел Міхальчука на трэці дзень пасьля акцыі трапіў у аблогу. У баі камандзір загінуў.

Паводле іншай вэрсіі, савецкая агентура ў Лёндане паведаміла ў Маскву дакладную дату і месца дэсанту Міхальчука. Таму на Берасьцейшчыне яго ўжо чакалі вялікія сілы дзяржбясьпекі й унутраных войскаў, ішлі аблавы і праверкі. Аднак дэсантніку ўдалося вырвацца з аблогі. Дзяржбясьпека шукала яго два гады. Калі ж Міхальчук з сваімі партызанамі ўпершыню «засьвяціўся», іх лякалізавалі, і кола замкнулася…

Але як кіраўніцтва БВР ужо восеньню 1953-га даведалася пра дакладную дату і месца гібелі свайго афіцэра? Інфармацыя магла пайсьці праз радыёперадатчык (альбо іншым чынам). А мо ня ўсе партызаны Міхальчука былі зьнішчаныя чэкістамі й хтосьці зь іх дабраўся да Заходняй Нямеччыны?

Бо тамтэйшая газэта «Незалежная Беларусь» (яе выдавала БВР) у №8

IREX-PROMEDIA

(14) за верасень-кастрычнік 1953 г. надрукавала такі нэкралёг: «Старшы лейтэнант партызанскіх аддзелаў, сябра БВР і ЗБП Сьв. Памяці **Сымон Міхальчук** загінуў гераічнай сьмерцю ў барацьбе з бальшавіцкім акупантам Беларусі дня 28 сакавіка 1953 году ў лясох каля Запрудаў у раёне Кобрына, у веку 38 гадоў…» І ўсё. Пра тое, як трапіў Сымон Міхальчук на Бацькаўшчыну і пры якіх абставінах ён загінуў, нічога не паведамлялася. Такія былі ўмовы канспірацыі. Невядома зь якой прычыны ў пазьнейшых публікацыях у эміграцыйнай прэсе Міхальчука называлі Міхалюком. Мы ж гэтую памылку выпраўляем.

Сяргей Ёрш

Літаратура ад Абэ да Караткевіча для Расеі

У продажы зьявіўся даведнік «Великие писатели XX века» (выдавецтва «Мартин», Масква). Ад іншай гэткага кшталту расейскае прадукцыі кніга розьніцца тым, што рабілі яе беларускія навукоўцы. На пытаньні карэспандэнта «НН» адказвае ўкладальнік, загадчык катэдры беларускай мовы і літаратуры Менскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўнівэрсытэту Пятро Васючэнка.

АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

«НН»: Чым вы кіраваліся, калі выбіралі вялікіх сярод пісьменьнікаў?

П.В.: Уласным бачаньнем літаратуры — як яна бачыцца зь Менску. І яшчэ адзін крытэр: творца вялікі, калі стварыў свой хранатоп — адметны мастацкі сьвет, які жыве незалежна ад аўтара.

«НН»: Хто з «славутых» ня трапіў у кнігу?

П.В.: Мы не арыентаваліся на прэмію Нобэля. Яе ж не атрымалі Кафка, Пруст, Чэхаў, Пшыбышэўскі і шмат хто яшчэ. У кнізе — ня толькі элітныя аўтары, але і дзіцячыя пісьменьнікі, фантасты, аўтары прыгодніцкіх і дэтэктыўных твораў. Там суіснуюць Кіплінг і Купала, Сянкевіч і Ліндгрэн. Нехта не пабачыць у кнізе сваіх улюбёных Павіча, Эка, Кундэру, Артура Мілера... Папросту не знайшлося спэцыялістаў, якія б глыбока разьбіраліся ў іх творчасьці. Ніхто з тых навукоўцаў, да якіх я зьвяртаўся, ня ўзяўся пісаць аглядны артыкул пра іх.

«НН»: Ці трапілі б у кнігу Быкаў, Караткевіч і Купала, калі б яе рыхтавалі не беларускія навукоўцы?

П.В.: Мы абралі тых аўтараў, якія стварылі самыя ўнікальныя хранатопы. Намагаліся паказаць невядомага расейцам Купалу — не савецкага пісьменьніка, а сымбаліста, паэта трагічнага сьветаскладу, чалавека, надзеленага апакаліптычным мысьленьнем. Караткевіча — нэарамантыка, якога можна разглядаць у повязі з творцамі, што «раскручвалі» нацыянальную гісторыю, — Сянкевічам, Скотам, Рэймаркам. Васіля Быкава ж літаратурны сьвет называе апошнім рэалістам. Ён адыграў ролю ў абнаўленьні мадэлі экзыстэнцыялізму, ставячы пытаньне, ці чалавечна выпрабоўваць асобу жорсткім выбарам.

«НН»: Чым гэтае выданьне розьніцца ад падобных, якіх пры канцы стагодзьдзя павыходзіла шмат?

П.В.: Пра беларусацэнтрычнасьць я ўжо казаў. Апроч таго, мы даём адказ на пытаньне: хто такі ён, пісьменьнік XX ст., і хто такая яна, літаратура XX ст.

У даведніку ня толькі факты «афіцыйнае» біяграфіі ды пералічэньне твораў. Мы ня грэбавалі сэнсацыямі: напісалі, скажам, колькі разоў жаніўся Генры Мілер. Бо ўнутраны сьвет уплывае на сьвет мастацкі.

Увайшлі ў сьпіс тыя, хто ледзь уступіў у XX ст. (Талстой, Твэн, Уайльд). А некаторыя, наадварот, вырасьлі ў XX ст. і ўрасьлі ў XXI. Цэнтар кнігі — XX ст., але каранямі й кронай яна ўлазіць у суседнія.

«НН»: Няўжо расейцаў так цікавіць беларускі погляд на сусьветную літаратуру?

П.В.: Не, іх цікавяць канцэптуальныя праекты. У Расеі ўжо выходзілі кнігі гэткага кшталту, напрыклад «100 пісьменьнікаў XX ст.». Там пераважная большасьць нямецкамоўных аўтараў. Мы ж у сваёй кнізе адвялі шмат месца славянскім.

«НН»: Мо плянуеце выдаць такога кшталту даведнік па-беларуску?

П.В.: Праца над беларускамоўнай вэрсіяй пачалася. Мы ўкладаем і ўзгадняем сьпіс вялікіх пісьменьнікаў.

«НН»: Ці будзе новая вэрсія розьніцца ад расейскай зьместам?

П.В.: Так. Сьпіс беларускіх аўтараў будзе пашыраны — увойдуць Колас, Гарэцкі, Багдановіч і іншыя. Зьявяцца ўкраінцы. Колькасьць расейскіх пісьменьнікаў, літаратараў ЗША скароціцца. Гэтая кніга будзе адрасавана толькі беларускаму чытачу: школьніку, студэнту, настаўніку і кожнаму, хто цікавіцца літаратурай. Наш варыянт будзе таўсьцейшы за расейскі — цяпер мы шукаем спэцыялістаў, якія б наважыліся напісаць пра тых самых Павіча, Эка, Кундэру ды іншых незакранутых у расейскамоўнай вэрсіі аўтараў.

«НН»: Хто ж, дарэчы, браў удзел у падрыхтоўцы кнігі?

П.В.: Агульнае кіраўніцтва ажыцьцяўляў Уладзімер Сіўчыкаў. Артыкулы складалі супрацоўнікі ВНУ і літаратурныя крытыкі: Юрась Стулаў пісаў пра амэрыканскіх пісьменьнікаў, Галіна Тычка — пра польскіх, Вольга Судлянкова — пра літаратуру ангельскамоўную. Спрычыніліся Ірына Шаблоўская, Людка Сільнова, Галіна Адамовіч і іншыя. Працавалі паасобку, кожны на сваёй дзялянцы. Зьбіраньне матэрыялу й пісаньне артыкулаў заняло каля двух гадоў.

Гутарыў Сяргей Будкін

Saeculi vitia, non hominis?

Андрэй Курэйчык

«Згублены рай»

Насуперак першаму імпульсу, назву п'есы Андрэя Курэйчыка «Згублены рай» ня варта чытаць як «згублены сорам». Маладога драматурга не западозрыш у сьвядомым плягіяце.

Ёсьць такі ўзровень, для якога плягіят выглядае занадта вытанчаным. Не зьвінаваціць непісьменнага папуаса ў інтэлектуальным рабунку, калі той амаль да месца вымавіць «быць або ня быць». Неістотна, ці дайшоў ён да гэтае мудрасьці сам, ці пачуў ад місіянэра. Біблійную тэматыку сп.Курэйчык інтэрпрэтуе нагэтулькі саматужна, што пэўныя паралелі зь якімі заўгодна творамі можна тлумачыць чыстай выпадковасьцю.

Нейкі «місіянэр» паведаміў яму гісторыю пра Адама і ягоную сям'ю, але, відаць, ня меў часу распавесьці, што нарасло вакол сюжэту за некалькі тысячагодзьдзяў. Вучань зразумеў значнасьць прыгодаў першых людзей, пра якія выпадкам даведаўся, і, адчуўшы першыя павевы натхненьня, узяўся рабіць з гісторыі пра Адама і Еву п'есу.

Курэйчык выкладае сюжэт так, як мог бы рабіць унук Каіна, седзячы з сваімі ўнукамі перад шатром недзе пасярод неабсяжнае пустэчы. Для яго не было шчэ нічога, апроч выгнаньня не такіх і далёкіх Прабацькоў з Раю ды першага забойства чалавека чалавекам. Будучыя вякі на ціснулі на прастадушнага пастуха. Ён, кіруючыся адно сваім пачуцьцём здаровага сэнсу, расказваў малым пра дачыненьні продкаў з Госпадам і пра тое, чым гэта скончылася.

Бо відавочна, што сам апавядальнік ніякіх дачыненьняў з вышэйшым пачаткам не падтрымліваў і ніякага ўяўленьня пра яго ня меў. Сцэну няўдалага спакушэньня Каіна Госпадам наўрад ці мог прыдумаць той, хто хоць раз задумаўся, што ёсьць Рай і Бог. Будучага братазабойцу запрашаюць у Эдэм, а ён адмаўляецца, бо туды не бяруць ягоных бацькоў. Чалавек, абазнаны ў рэлігіі, быў бы раструшчаны цяжарам непазьбежных пытаньняў. Ад чаго адмаўляецца Каін — ад яднаньня з Богам? Ці шчырая тая прапанова Бога, які ведае ўсё, у тым ліку і тое, што добры сын Каін ня будзе шчасьлівы ў Раі, куды не патрапяць ягоныя бацькі? Пытаньні множацца. Але супрацьстаяць ім можа або чалавек выключнай веры, веды й таленту, або tabula rasa, на якой толькі ўчора нехта пакінуў пару вершаў з кнігі Быцьця. Чалавек, які не чытаў ня толькі Мільтана.

Нацыянальны тэатар краіны, якая на ўсіх магчымых узроўнях заяўляе пра свае хрысьціянскія традыцыі, паставіў п'есу сп.Курэйчыка. І каб хто хацеў лепш выказаць, наколькі Беларусь зьдзічэла за XX стагодзьдзе, ня здолеў бы. Не сьпяшайцеся пужацца — у «Згубленым Раі» няма нічога блюзьнерскага, прынамсі, на густ нерэлігійнага чалавека. І літаратурны ўзровень п'есы — недзе на мяжы добрае студэнцкае самадзейнасьці — не выклікае ўнутранага пратэсту. Рэжысура здольная зрабіць з гэтай загатоўкі відовішча. «Згублены рай» уражвае іншым — адарванасьцю ад хрысьціянскай культуры, якая, здавалася б, закладзеная ў нас амаль на генэтычным узроўні.

Дзе ў Эўропе можна да дваццаці зь нечым гадоў пасьпяхова пазьбегчы начаткаў хрысьціянскага вучэньня? І пры гэтым атрымаць вышэйшую адукацыю, напісаць п'есу ды прасунуць яе на сцэну сталічнага тэатру? На якой нябачанай высьпе, якім акіянам аддзеленай ад касьцёлаў, кірхаў, цэркваў, сынагог і мячэтаў, ад бібліятэк і кнігарняў, ад выхавацеляў і настаўнікаў? Дзе павінен жыць літаратурны Маўглі, каб захаваць чысьціню свайго дапытлівага «я» ад стагодзьдзямі рыхтаваных адказаў на вечныя пытаньні? Цяпер я ведаю — дзе. У Менску.

Таму хачу публічна падзякаваць сьмеламу аўтару і пажадаць далейшае плённае працы. Бо яго нам не хапала. Толькі не абцяжаранае ведамі дзіця можа заўважыць і сказаць уголас, чаго вартыя шаты «духоўнасьці», якімі так ганарыцца наша грамадзтва. А калі паведамленьне набывае форму п'есы на прэстыжнай сцэне ці артыкулу ў буйной газэце... Гэта ўжо мастацтва пэрформансу, якое ня сьнілася Алесю Пушкіну.

Пакорпаўшыся добра ў слоўніку, адшукаў адпаведнае лацінскае выслоўе. Мо дапраўды, хібы Курэйчыкавай п'есы ёсьць **хібамі часу, а не чалавека**?

Даніла Жукоўскі, Горадня

● ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ ●

ВІТАНЬНІ

Дарагі Франку! З Днём народзінаў! Посьпехаў ня толькі ў алімпіядах і «Трыкутніку»! Годнага завяршэньня любой справы. Мы цябе любім! Ружана, Радаслава

Дарагі Франку! З Днём народзінаў! Посьпехаў у вучобе і грамадзкіх справах. Марыя Сафро

Франку! З Днём народзінаў! Няхай заўсёды будуць побач з табою надзейныя сябры! Ліцэй, 21 група

Віншую Сяргея Дубаўца з Днём Волі! Зычу посьпехаў, чакаем новых артыкулаў і эсэ. Зьміцер Панкавец

Шаноўная Юлія Каспар! Маем гонар павіншаваць Вас з Днём народзінаў (Дурняў). Твае сябры з 2 курсу

КАНТАКТЫ

«Дык чувайце, молячыся ўвесь час... каб маглі стаць перад Сынам Чалавечым». Лук 21:36. Кожную нядзелю а 18-й беларускамоўнае богаслужэньне ў царкве «Ласка Божая»: Гурскага, 48

Увага! Зьявіліся ў продажы саколкі з выявай «Пагоні» з надпісам на трох мовах «Жыве Беларусь!», а таксама саколкі «Narodny Albom». Таксама маецца вялікі выбар беларускай музычнай прадукцыі. Прапануем выгаднае супрацоўніцтва па распаўсюдзе ў рэгіёнах. Т.: (8-0296) 49-08-88. А/с 5, 220085, Менск, wital@tut.by, www.BMA.home.by

Ці засталіся яшчэ верныя фанаты «Белшыны»? Калі так — яднаймася! Футбол, «Белшына», Радзіма!

Мужчына-пэнсіянэр, 56 гадоў, разьведзены, пазнаёмліцца з жанчынай 30—50 гадоў. Ёсьць кватэра. Т.: 254-66-02, Міхаіл

КВАТЭРА

Набудзем 1—2-пакаёвую кватэру па лініі мэтро. Пэйдж.: 211-85-85, аб.2499

Маладая сям'я (2 чал.) здыме 1-пакаёвую кватэру ў Серабранцы. Парадак і своечасовую аплату гарантуем. Т.: (8-0297) 76-09-65

ПРАЦА

Надрукую радавод (беларуская (наркамаўка, тарашкевіца), расейская). Augen1975@mail.ru

Навучу дзетак беларускай і ангельскай мове. Т.: 52-11-30, 238-80-17

Калі Вам ад 18 да 24, Вы не належыце ні да якіх палітычных аб'яднаньняў, але ўвесь час рухаецеся наперад, тады калі ласка, запрашаю ў клюб «Pro patria 140 Ri». А/с 50, 225860, Кобрынь. E-mail: Rexmund@tut.by

450 год Рэфармацыі на Беларусі

Міжнародная канфэрэнцыя

«Рэфармацыя і сучаснасьць: хрысьціянская духоўнасьць, тэалёгія, культура»

· Выступы багасловаў, гісторыкаў; · Хрысьціянская харавая музыка XVI стагодзьдзя.

Канфэрэнцыя адбудзецца **5–6 красавіка** ў Доме вэтэранаў (Я.Купалы, 21). Пачатак а 10–й гадзіне. Запрашаем усіх, хто цікавіцца хрысьціянствам, гісторыяй Беларусі, станам сучаснага духоўнага жыцьця. Даведкі па тэл. 249–98–38.

КОНКУРС «НН»

У мінулым нумары «НН» абвясьціла конкурс памятак на пасьлядоўнасьць колераў спэктру. Маем першыя прапановы.

Чмялі праганяюць/адганяюць жукоў зь буйных суквецьцяў фасолі.

Чаму палескі жораў захацеў быць сырыйскім фазаном?

Чатыры прусы/аўстрыйцы жадалі знайсьці бясьпечны спосаб фэхтаваньня.

Чапля паабяцала/абяцала жораву захаваць балотную сьціплую фаўну.

Сям'я Карцавых, Менск

● НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ ●

Анішчанка Я. Генэральнае межаваньне ў Беларусі: Дапаўненьне да кнігі «Генэральнае межаваньне ў Беларусі». — Горкі—Магілёў, 2002. — 123 с.

У кнізе акрэсьленыя станоўчыя і адмоўныя бакі генэральнага межаваньня — прымусовага мерапрыемства, зьвязанага з умяшаньнем дзяржавы ў правы шляхты на валоданьне зямлёю. Ладзілі яго ў Магілёўскай і Полацкай губэрнях пасьля далучэньня іх да Расейскай імпэрыі. У якасьці дадатку зьмяшчаецца «Сьпіс населеных пунктаў усходнебеларускіх губэрняў у 1783—85 г.» і мапы. Цана выданьня ў «Акадэмкнізе» — 1920 руб. Наклад 300 ас.

Гапеева В. Рэканструкцыя неба. — Менск: Логвінаў, 2003. — 142 с.: іл.

У зборнік маладой аўтаркі ўвайшлі выбраныя вершы, п'еса «Калекцыянэр» ды раман «Рэканструкцыя неба». Паэтка ўмее зьдзівіць нечаканасьцю вобразаў. Наклад 200 ас. Прадаецца на выставах у БНФ ды ТБМ, у «Падпісных выданьнях».

Падрыхтавала Тацяна Вабішчэвіч

IN MEMORIAM

Сяргей Абадоўскі

23 сакавіка на 53-м годзе жыцьця раптоўна памёр грамадзкі дзяяч, дырэктар Магілёўскага праваабарончага цэнтру Сяргей Абадоўскі. Сяргей належаў да пакаленьня дэмакратаў яшчэ першай, «перабудовачнай» хвалі. На пачатку 90-х ён актыўна ўдзельнічаў у заснаваньні Свабоднага прафсаюзу, стаў першым старшынём Магілёўскай абласной арганізацыі СПБ. У 1996 г. Сяргей Абадоўскі з аднадумцамі стварае Магілёўскі праваабарончы цэнтар. Сумесна зь мясцовай філіяй Беларускага Хельсынскага камітэту ён наладжвае працу грамадзкай праваабарончай прыёмнай. Зь ягонай ініцыятывы быў праведзены маніторынг працы судоў у Магілёве, а па выніках выйшла «Шэрая кніга», што мела шырокі грамадзкі рэзананс. Ён спадзяваўся яшчэ нямала зрабіць на карысьць людзей, Бацькаўшчыны. На жаль, не пасьпеў. Ягоны зямны час спыніўся. Але засталіся справы. Засталіся людзі, якія не забудуцца на зробленае Сяргеем Абадоўскім.

Пахаваньне адбылося 25 сакавіка ў Магілёве на могілках у раёне вуліцы «30 гадоў Перамогі».

Сябры з Магілёўскага праваабарончага цэнтру, «Кола сяброў», «Жаночага цэнтру падтрымкі і самаадукацыі», «Лекарскага саюзу» ды інш.

Ня стала «жалезнай лэдзі» ўкраінскай палітыкі

12 сакавіка ў мюнхенскай клініцы на 83-м годзе жыцьця памерла ўкраінская дзяячка, дэпутатка Вярхоўнай Рады Украіны Яраслава Стэцко. З маладых гадоў яна ўдзельнічала ў Арганізацыі ўкраінскіх нацыяналістаў, за што ў 1943 г. была кінутая ў нямецкі канцлягер. Апынуўшыся па вайне на Захадзе, уваходзіла ў кіраўніцтва бандэраўскай часткі АУН. У 1992 г. Я.Стэцко вярнулася з эміграцыі ва Украіну. Яна стварыла Кангрэс украінскіх нацыяналістаў, адрадзіла структуры АУН, стала дэпутаткай парлямэнту. «Жалезную лэдзі» ўкраінскай палітыкі паважалі за прынцыповасьць і левыя, і правыя.

Яраслава Стэцко на эміграцыі цесна супрацоўнічала зь Беларускім вызвольным фронтам, сачыла за падзеямі ў нашай краіне аж да апошняга часу. Ведала беларускую мову.

Яе пахавалі ў Кіеве. Разьвітацца зь Я.Стэцко прыйшло каля 10 тыс. чалавек, сярод якіх былі Віктар Ющанка і Юлія Цімашэнка.

СЁ

Наша Ніва КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

Тэкст _____

_____

Імя і прозьвішча _____

Адрас, тэлефон _____

ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

Канцэрт «NRM» перанесены

Ніводнае турнэ «NRM» не абыходзілася без адмены ці пераносу канцэртаў. Абласныя ўлады лічаць музыкаў небясьпечнымі і шкоднымі — пра гэта, уласна, і распавядае п'еса «Дом культуры», якую музыкі прэзэнтуюць сёлета па гарадах Беларусі. Другі канцэрт турнэ пераносіцца — у Горадні гурт будзе 3 красавіка. Арганізатары кажуць, што мясцовыя ўлады не ўпадабалі дзень, у які мусіў адбыцца канцэрт, — 26 сакавіка. Надта блізка ён стаіць да 25-га... Астатнія канцэрты адбудуцца па ранейшым раскладзе: 27 сакавіка — Берасьце, 28-га — Гомель.

Начны фэст

28 сакавіка ў клюбе «Рэактар» адбудзецца начная імпрэза. А 23-й там распачнецца «Вялікі фэст сучаснай музыкі і моды». У жывым канцэрце возьмуць удзел блізу 10 гуртоў. Можна будзе паслухаць і рэп у выкананьні «Нестандартнага варыянту» (таго, што зрабіў рэмікс на «Паветраны шар» «NRM»), і псыхадэл-фольк («Нагуаль»), і ўкраінскі поп-рок («Нічний портьйо»), і менскі панк («Голая манашка»), і гард-рок («D-Versia»)...

Пасьля надыдзе чарга аванґардная моды. Маладыя мадэльеры зь Дзяржаўнага тэхналягічнага каледжу пакажуць свае калекцыі. За танцавальную частку праграмы ў той вечар будуць адказваць калектывы «Міракль» і «Катманду», а за драматычную — тэатры Ільлі Сіна і «Еуе». Абодва вядомыя аматарам пэрформансаў. Імпрэза працягнецца да 6-й ранку. Квіток на яе будзе каштаваць 4500 руб. (у папярэднім продажы) і 6000 руб. (пры ўваходзе).

Вайцюшкевіч і Маякоўскі

2 красавіка ў Тэатры юнага гледача Зьміцер Вайцюшкевіч разам з «WZorkiestra» мае прэзэнтаваць праграму на вершы Ўладзімера Маякоўскага. Упершыню Тодар засьпявае перад гледачамі па-расейску. Ён мае прадставіць 7 песьняў, сярод іх будуць «Про это», «Бруклинский мост», «Бродвей» і інш. Паралельна Вайцюшкевіч працуе над праграмай «Поры году» на вершы Алеся Камоцкага. Сёе-тое з гэтай праграмы таксама можна будзе пачуць на канцэрце, як і песьні з «Цацачнай крамы», «Балядаў». Прагучаць і кампазыцыі на вершы Караткевіча, Жылкі. Пачатак у 19.00. Цана квітка 7—9 тыс. руб.

Сяргей Будкін

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

Сьвятлане П. з Кастрыцы. Дасланыя Вамі «Сабачыя гісторыі» для газэты не падыходзяць, бо абстрактныя, бесканфліктныя. Кранайце балючыя праблемы нашага жыцьця.

Андрэю А. з Гомелю. Напісана гладка. Але сюжэты нераспрацаваныя. Не стае інтрыгі, нечаканых паваротаў. Часам злоўжываеце апавядальнай манерай — тэкст перагружаны «размоўнымі» канструкцыямі. За формай губляецца зьмест.

Міколу Б. з Дубровы. Памкненьні пэўнага беларускага палітыка кіраваць суседняй дзяржавай — «барадаты» сюжэт. Пра гэта ўсе ўжо даўно напісалі. Таму фэльетон «НН» не падыходзіць.

Зьмітру К. з Воршы. Захад — найперш радзіма дэмакратычных каштоўнасьцяў, а не «заробку ў 1000 даляраў».

Усеваладу С. зь Менску. З паведамленьня пра выставу чытач атрымае слабое ўяўленьне пра тое, што ж там канкрэтна выстаўляецца і ці варта туды ісьці. Не пазначана таксама, колькі каштуе квіток у музэй і ці трэба купляць асобны на батлейку.

Ірэне Х. Як водгук на матэрыял «Аголеная Беларусь» Ваш ліст пайсьці ня можа, бо прысьвечаны іншай тэматыцы. У друк не бяром яго яшчэ й таму, што ў ім няма нічога новага проці вашых ранейшых допісаў. Нічога не зьмянілася ў Вашым натурыстычным жыцьці!

Пятруку К. зь Вялікага Сяла. Мо запішэце свае згадкі — як служылася беларусу на флёце? Зь цікавымі рэальнымі выпадкамі і старымі, забытымі показкамі.

Янушу Л. зь Віцебску. Дасланае Вамі інтэрвію з нэпальцам пра ўсё і ні пра што. Большасьць сказанага рэспандэнтам пра сваю краіну можна знайсьці ў падручніку па краіназнаўстве. Ягоныя развагі пра Беларусь мала розьняцца ад меркаваньняў іншых замежнікаў. Лепей будаваць гутарку вакол якойсьці канкрэтнай праблемы.

Віктару Д. зь Менску. На Вашых разважаньнях пра беларускі этнас ляжыць адбітак каляніяльных стэрэатыпаў. Манархічная тэорыя — блытаная. Што такое «манархія, якая ёсьць рэспублікай»? Манарх, запрошаны «з-за мора», не гарантуе зьяднаньня нацыі.

Зьмітру К. зь Віцебску. Віншуем з нараджэньнем дачкі!

Андрэю А. з Гомелю. Апавяданьні не для «НН».

Конкурс «Студэнцкай думкі»

Рэдакцыя часопісу «CD» /Студэнцкая Думка/ у сакавіку—траўні 2003 г. плянуе правесьці Ўсебеларускі конкурс коміксу і карыкатуры «Антыкаліч-1». Намінацыі: ГАЛАВА КВАДРАТНАЯ. Варыяцыі на тэму гучных тэле-, мэдыя-, кіна- і рэклямных праектаў, а таксама гісторыі з жыцьця тэле-, кіна- і мультгерояў. КРАІНА НЯПУЖАНЫХ ПАРТЫЗАНАЎ. Новы погляд на беларускую рэчаіснасьць. ЧЫСТЫ Я. Супраць наркотыкаў, тытуню, алькаголю і забруджаньня навакольнага асяродзьдзя. Пераможцаў чакаюць каштоўныя прызы ад спонсараў і грашовыя прэміі ад рэдакцыі. Па пытаньнях удзелу і спонсарства зьвяртайцеся: тэл. 213-22-19, 8-029-626-69-36. E-mail: studumka@tut.by

Наша Ніва

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі	Наста Бакшанская
галоўны рэдактар	Андрэй Дынько
выпускны рэдактар	Сяргей Ёрш
карэктар	Сяргей Петрыкевіч
карэктарка	Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара	Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар	Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік	Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:
220050, Менск, а/с 537
Tel/fax: (017) 284-73-29, (0296) 13-32-32.
E-mail: nn@promedia.by
On-line: www.nn.by

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а.

Наклад 3889.

Нумар падпісаны ў друк 26.03.2003.

Замова № 1648.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а